Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 ЛІСТАПАДА 2015 г. ПЯТНІЦА № 220 (28078) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



«Прамая лінія» па пытаннях працы

СТАР. 4



Беларускаму радыё — 90

СТАР. 5



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

**20 КАНАЛАЎ**

# ГАДАВАЦЬ ПТУШАК — ТАКСАМА НАВУКА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Вопытная навуковая станцыя па птушкагадоўлі ў Заслаўі. Загадчык аддзела кармлення кандыдат сельскагаспадарчых навук Анатоль РАМАШКА і начальнік цэха Уладзімір ЯРАШЭВІЧ у лабараторыі.**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр:**

*«Беларусь прадастаўляе эфектыўную пляцоўку для дзейнасці інвестараў, кіраўніцтва краіны гатова аказаць падтрымку пашырэнню ініцыятыў для максімальна паспяховай рэалізацыі праектаў. Аб пастаянным паляпшэнні вядзення бізнесу ў Беларусі сведчыць павышэнне пазіцый краіны сярод іншых дзяржаў у міжнародных рэйтынгах. Напрыклад, у рэйтынгу «Вядзенне бізнесу — 2016» Беларусь займае сёння 44-ю пазіцыю».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.11.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17745,00 | ▲ |
| Еўра | 19051,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 271,35 | ▼ |
| Укр. грыўня | 769,85 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Фінансы

## ГРОШЫ НЕ ЛЮБЯЦЬ МІТУСНІ

**Дэкрэт №7 змяняе класіфікацыю банкаўскіх укладаў і прадугледжвае падаходны падатак на кароткія дэпазіты**

**Такім чынам, з 12 лістапада ў нашай краіне дагаворы тэрміновага і ўмоўнага банкаўскага ўкладу будуць падраздзяляцца на безадзыўныя і адзыўныя, пра што паведаміў першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Тарас НАДОЛЬНЫ. Гэта прадугледжана Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11 лістапада 2015 года №7 «Аб прыцягненні грашовых сродкаў ва ўклады (дэпазіты)».**



**Тарас НАДОЛЬНЫ.**

Фота БЕЛТА.

### Уклады падзялілі «на часткі»

Безадзыўныя ўклады не прадугледжваюць датэрміновага вяртання сродкаў. А пры заключэнні адзыўнага дагавора будзе прадугледжвацца магчымасць датэрміновага вяртання ўкладу па ініцыятыве ўкладчыка. Пры гэтым канкрэтныя тэрміны і ўмовы вяртання ўкладу будуць прапісвацца ў дагаворы паміж банкам і ўкладчыкам. Нагадаю, што раней усе дэпазіты ў краіне былі адзыўныя — у незалежнасці ад тэрміну дагавора банк быў абавязаны на працягу пяці дзён вярнуць па патрабаванні ўкладчыка яго сродкі (часам — са стратай працэнтаў, часам — без). Цяпер, згодна з дэкрэтам, укладчык не зможа патрабаваць датэрміновага вяртання ўкладу па безадзыўным дэпазіце.

Дагаворы банкаўскіх укладаў (дэпазітаў), якія былі заключаны да 12 лістапада, і надалей будуць выконвацца на ранейшых умовах на працягу ўсяго тэрміну дзеяння. Аднак пралангацыя такіх укладаў ужо не прадугледжваецца. Пры працягу дагавора на новы тэрмін яго палажэнні павінны быць прыведзены ў адпаведнасць з патрабаваннямі дэкрэта №7.

«Пры гэтым дзяржава па-ранейшаму гарантуе поўную захаванасць грашовых сродкаў фізічных асоб у беларускіх рублях і замежнай валюце, размешчаных на рахунках і (або) ва ўклады ў банках, і пакрыццё 100 працэнтаў сумы гэтых сродкаў у валюце рахунку або ўкладу з выплатай працэнтаў», — гаворыцца ў паведамленні прэс-службы Нацбанка.

СТАР. 2

■ Надвор'е

## МЕСЦАМІ ЎЖО І МОКРЫ СНЕГ

**У найбліжэйшыя дні надвор'е на тэрыторыі Беларусі будуць вызначаць атмасферныя франты, якія рухаюцца да нас з боку Балтыйскага мора. Аб гэтым паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Фота БЕЛТА.

У пятніцу па ўсходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 4-10 градусаў. У суботу і нядзелю надвор'ем у нас будзе кіраваць цыклон, які перамяшчаецца са Швецыі праз краіны Балтыі ўглыб еўрапейскай тэрыторыі Расіі. Таму ў суботу часам пройдуць дажджы, а ўначы і раніцай месцамі магчымы туман. Раніцай і ўдзень па паўднёвым захадзе прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15-20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе 1-7 цяпла, а ў крайніх усходніх раёнах пры праясненнях будзе ад нуля да мінус 2 градусаў. Удзень будзе 4-9 цяпла. У нядзелю ўвогуле паўсюдна пройдуць кароткачасовыя дажджы, а па паўночным усходзе магчымы нават мокры снег. Уначы месцамі чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15-20 м/с. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе 1-7 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня, калі цыклон адыдзе ўглыб еўрапейскай тэрыторыі Расіі, у Беларусь стануць паступаць больш халодныя паветраныя масы з Балтыйскага мора. Па-ранейшаму будзе дажджліва, у паўночна-ўсходніх раёнах сіноптыкі не выключаюць мокры снег і слабы галалёд. Уначы тэмпература паветра будзе змяняцца ад мінус 1-3 градусаў па паўночным усходзе да 4-7 цяпла па паўднёвым захадзе. Будзе даволі холадна на паўночным усходзе нават удзень, дзе чакаецца ад 0 да плюс 2 градусаў, аднак на паўднёвым захадзе — цёпла (плюс 6-10 градусаў).

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ФАБРЫКІ ЗДАРОЎЯ: УВАХОД УСІМ ДАЗВОЛЕНЫ

## Будаўніцтва спартыўных аб'ектаў у краіне павінна быць танным і якасным

**Гэтага запатрабаваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падчас наведвання новага шматфункцыянальнага фізкультурна-аздараўленчага комплексу «Мандарын» у Мінску.**

Кіраўніка дзяржавы праінфармавалі аб развіцці комплексу фізкультурна-аздараўленчых паслуг для жыхароў Мінска і аб працы новага аб'екта, паведамляе прэс-служба беларускага лідара. Комплекс быў створаны па даручэнні Прэзідэнта. Будаўніцтва аб'екта вялося са студзеня 2013-га па кастрычнік 2015 года за кошт бюджэтных сродкаў Мінска з частковым фінансаваннем эксплуатуючай арганізацыяй «Аква-Мінск».

Аляксандр Лукашэнка, азнаёміўшыся з дзейнасцю комплексу, асноўнымі напрамкамі работы якога з'яўляюцца паслугі водна-тэрмальнай зоны, навучанне плаванню, фітнес, адзінаборствы, і пагутарыўшы з яго наведвальнікамі, станоўча ацаніў стварэнне ўмовы для заняткаў фізкультурай і спортам.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў краіне створана дастаткова спартыўных аб'ектаў дзяржаўнай формы ўласнасці. «Падобныя палацы каштуюць дорага, і, адпаведна, паслугі — дарагія, што людзі павінны дакладна разумець», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. На яго думку, сёння трэба будаваць звычайныя, абсалютна танныя басейны і спартыўныя аб'екты. Ён даручыў у найбліжэйшы час падрыхтаваць тыпавыя праекты недарагіх басейнаў і спартыўных комплексаў. Пры гэтым якасць, несумненна, застаецца самым галоўным фактарам.

Акрамя таго, Прэзідэнт звярнуў увагу кіраўніцтва Мінспорту і турызму, Мінгарвыканкама на магчымасць прыстасаваць пустуючыя памяшканні пад спартыўныя аб'екты. Паколькі выкарыстанне незадзейнічаных памяшканняў не запатрабуе істотных выдаткаў, такім чынам, і паслугі тут павінны быць недарагімі.

Пры гэтым патрабаванне Аляксандра Лукашэнкі наступнае: спартыўныя аб'екты павінны быць цалкам загружаны з раніцы да позняга вечара, каб людзі маглі займацца спортам у зручны для іх час. Кіраўнік дзяржавы лічыць недапушчальным, калі спартыўныя аб'екты, у якія ўкладзены немалыя сродкі, выкарыстоўваюцца не поўнасцю і там няма дастатковай колькасці наведвальнікаў. Прэзідэнт запатрабаваў ад чыноўнікаў вырашыць праблему загружанасці спартыўных аб'ектаў у Мінску, прыняўшы для гэтага ўсе неабходныя меры. Вялікую ролю ў гэтым адыгрывае і пастаянная папулярызацыя здаровага ладу жыцця і спорту.

З улікам далейшага масавага развіцця спорту ў краіне і будаўніцтва спартыўных аб'ектаў патрабуецца нямала сродкаў для набыцця абсталявання, якое ў большасці сваёй з'яўляецца імпартным. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы запатрабаваў разгледзець пытанне стварэння айчынных трэнажораў. Падобнае імпартазамяшчэнне дазволіць істотна скараціць выдаткі на спартыўныя аб'екты і такім чынам знізіць цэны на паслугі, якія ў іх аказваюцца. Пры гэтым для вытворчасці айчынных трэнажораў можна будзе задзейнічаць буйныя беларускія прадпрыемствы.

Прэзідэнт лічыць, што ў краіне неабходна яшчэ больш папулярызаваць заняткі фізкультурай і спортам, здаровы лад жыцця. «Спартыўныя аб'екты — гэта сапраўдныя фабрыкі здароўя. Чым больш людзей будзе тут, тым менш у бальніцах і аптэках. І дзяржаве гэта абыдзецца танней», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

На яго думку, у Мінску і наогул у краіне павінна быць больш спартыўных аб'ектаў крокавай даступнасці. Прычым, гаворка ідзе не толькі аб спартыўных залах, але і аб спартыўных збудаваннях на адкрытых пляцоўках, веладарожках. Пры гэтым Прэзідэнт звярнуў увагу чыноўнікаў на тое, што цэны паслуг у спартыўных аб'ектах не павінны быць завоблачнымі. «Працаваць, вядома, трэба не са стратай, але і задзіраць цэны не трэба», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт лічыць, што для заняткаў фізкультурай і спортам паўсюдна павінны быць створаны неабходныя ўмовы.

# ІНВЕСТЫЦЫЙНЫЯ ПРЫЯРЫТЭТЫ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка выдаў дэкрэт № 8, які выкладае ў новай рэдакцыі Дэкрэт ад 6 жніўня 2009 г. №10 «Аб стварэнні дадатковых умоў для інвестыцыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь».**

Дэкрэт прадугледжвае новаўвядзенні, якія раней не былі вызначаны інвестыцыйным заканадаўствам, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

Так, інвестыцыйныя дагаворы будуць заключацца толькі ў дачыненні прыярытэтных сектараў эканомікі, вызначаных урадам.

Зменены парадак прадастаўлення зямельных участкаў для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў. У прыватнасці, без аўкцыёну яны будуць выдзяляцца толькі з пераліку участкаў, прызначаных для наступнага прадастаўлення інвестарам, арганізаваным для будаўніцтва аб'ектаў, прадугледжаных заключанымі інвестыцыйнымі дамовамі. Прадугледжаная працэдура конкурснага адбору інвестара пры наяўнасці двух і больш інвестараў, якія прэтэндуюць на рэалізацыю інвестыцыйнага праекта на адным і тым жа зямельным участку. Гэта дазволіць забяспечыць аптымальнае і максімальна эфектыўнае выкарыстанне зямельных рэсурсаў.

Дэкрэтам таксама вызначаны шэраг дадатковых ільгот і прэферэнцый для інвестара. Пры гэтым асаблівая ўвага ў дэкрэце нададзена пытанням пакрыцця інвестарам ільгот, прэферэнцый у выпадку невыканання, неналежнага выканання ўмоў інвестыцыйнага дагавора, магчымасці вызвалення, растэрміноўкі (адтэрміноўкі) выплаты няўстойкі (штрафу, пені) за парушэнне інвестарам умоў інвестыцыйнага дагавора.

Акрамя таго, прадугледжваецца, што да інвестара не могуць быць прад'яўлены патрабаванні аб кампенсацыі сумы льгот, прэферэнцый і аб выплаце няўстойкі (штрафу, пені) у выпадку парушэння тэрмінаў і іншых умоў рэалізацыі інвестыцыйнага праекта ў сувязі з незаконнымі дзеяннямі (бяздзейнасцю) службовых асоб дзяржаўнага органа або выканкама, якія заключылі інвестыцыйны дагавор, іншага дзяржаўнага органа (арганізацыі) пры адсутнасці віны інвестара і (або) арганізацыі.

# ГРОШЫ НЕ ЛЮБЯЦЬ МІТУСНІ

## Умовы дэпазіту выбірае кліент

Зразумела, што безадзыўны ўклад будзе гарантаваць больш высокую прыбытковасць свaім уладальнікам, чым іншыя банкаўскія прадукты. «Сёння такі ўклад, з аднаго боку, не прадугледжвае датэрміновага зняцця грошай, але, з іншага боку, ён можа гарантаваць больш высокую даходнасць для фізічных асоб з пазіцыі кіравання сваімі зберажэннямі», — адзначыў Тарас Надольны. Пры гэтым нормамі дэкрэта прадугледжана ў асобных выпадках магчымасць датэрміновага скасавання дагавора нават безадзыўнага ўкладу. Аднак гэта можа адбыцца толькі са згоды ўкладаатрымальніка.

«Такія выпадкі будуць крайнім выключэннем. Рашэнне будзе прымацца непасрэдна банкам», — адзначыў Тарас Надольны. Ён дапусціў, што падставай для датэрміновага адклікання ўкладу могуць стаць нейкія трагічныя абставіны, якія закранулі самога ўкладчыка або яго сям'ю, калі тэрмінова патрэбны грошы. «Пры прад'яўленні адпаведных пацвярджальных дакументаў, я думаю, банк можа пайсці на тое, каб датэрмінова вярнуць грошы. Але гэта не будзе насіць сістэмны характар і не будзе стандартнай практыкай. Гаворка ідзе толькі пра выключныя выпадкі», — растлумачыў ён. У сувязі з гэтым Нацыянальны банк не збіраецца распрацоўваць нейкія крытэрыі або даваць банкам рэкамендацыі, што можна лічыць выключным выпадкам. Такое рашэнне можа прыняць толькі банк, у якім захоўваецца ўклад.

**Падаходны падатак будзе спаганяцца толькі з працэнтных даходаў, а не з усёй сумы ўкладу, і толькі ў тым выпадку, калі працэнтная стаўка, па якой атрыманы гэты даход, перавышае памер дзеючай у банку працэнтнай стаўкі па ўкладзе да запатрабавання.**

А ўвогуле, у дэкрэце №7 закладзена сама магчымасць выбару. «Кожны будзе сам выбіраць — атрымліваць больш высокі даход і згаджацца на ўмовы безадзыўнасці альбо мець магчымасць адклікання ўкладу па трохі меншай стаўцы», — адказаў Тарас Надольны.

## «Вілка» па розных укладах — 3-5%

Паводле ацэнак Нацбанка, узровень ставак па безадзыўных дэпазітах будзе 25-30%. «Верхняя мяжа — стаўка па дэпазітах грашовага рынку, ніжняя — стаўка рэфінансавання», — сказаў Тарас Надольны. Па адзыўной стаўцы працэнты стануць больш нізкімі, але ўмовы захавaюцца фактычна такія, як цяпер. «Прапануемы кліентам дыяпазон даходнасці будзе прыкладна 20-25%», — лічыць прадстаўнік Нацбанка.

Між іншым, нават па існуючых дэпазітах камерцыйныя банкі маюць права знізіць працэнты па вызначанай схеме, калі гэта прадугледжана дагаворам. Гэта магчыма ў тым выпадку, калі даходнасць укладу не прапісана ў дакуменце ў якасці фіксаванай велічыні, а банк мае права змяніць яе ў аднабаковым парадку.

## Не чапай рубель год, а валюту — два

Разам са змяненнем класіфікацыі банкаўскіх укладаў дэкрэтам №7 таксама прадугледжана змяненне падыходаў да льготнага падаткаабкладання даходаў, атрыманых фізічнымі асобамі ў выглядзе працэнтаў па банкаўскіх рахунках і ўкладах (дэпазітах) у банках і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацыях.

Праўда, гэтая норма дэкрэта пачне працаваць толькі налета пасля 1 красавіка. З гэтага часу пад падаходны падатак з фізічных асоб трапляюць працэнтныя даходы, атрыманыя пры фактычным размяшчэнні грашовых сродкаў на бягучых (разліковых) банкаўскіх рахунках і ва ўкладах (дэпазітах) на тэрмін, меншы за 1 год — у беларускіх рублях і меншы за 2 гады — у замежнай валюце. Пры гэтым падаходны падатак будзе спаганяцца



Святлана ШАЎЧЭНКА

толькі з працэнтных даходаў, а не з усёй сумы ўкладу, і толькі ў тым выпадку, калі працэнтная стаўка, па якой атрыманы гэты даход, перавышае памер дзеючай у банку працэнтнай стаўкі па ўкладзе да запатрабавання. Больш за тое, **намеснік міністра па падатках і зборах Беларусі Святлана ШАЎЧЭНКА** паведаміла, што апошняй умовай падаткаабкладання даходаў па ўкладах будзе той факт, што кароткі дэпазіт быў афармлены ўжо пасля 12 лістапада 2015 года (новыя дэпазіты).

## У інспекцыю ісці не трэба

Святлана Шаўчэнка яшчэ адзначыла, што сам банк з'яўляецца падатковым агентам. Менавіта ён і будзе падлічваць такі падатак, утрымліваць яго і накіроўваць у бюджэт. Самому чалавеку наведваць падатковую інспекцыю і аплачваць падобныя падаткі не трэба. Іх не трэба ўказваць у падатковай дэкларацыі і ў дэкларацыі па даходах і маёмасці.

Цяпер пры заключэнні дагавора банкі абавязаны падрабязна інфармаваць укладчыкаў аб усіх умовах прыцягнення ўкладу, а ў выпадку неабходнасці збірання падаходнага падатку з атрыманых укладчыкам працэнтных даходаў — аб суме пералічаных у бюджэт сродкаў.

## Без выключэнняў

«Палажэнні дэкрэта №7 распаўсюджваюцца ў тым ліку на замежнікаў», — паведаміў Тарас Надольны. Ён звярнуў увагу на тое, што ў тэксце дакумента не пазначана, што для нерэзідэнтаў устанаўліваюцца якія-небудзь абмежаванні або выключэнні. «Адпаведна, яны таксама будуць плаціць», — сказаў ён. Не прадугледжана ніякіх ільгот па гэтых падатках і для пенсіянераў.

## Каштоўныя дзяржпаперы пад падатак не трапілі

А вось валютныя аблігацыі Мінфіна для насельніцтва не будуць абкладацца падаходным падаткам. «Уводзіць падаходны падатак па валютных аблігацыях Мінфіна не плануецца, і нават не разглядаецца такая магчымасць», — запэўніў Тарас Надольны.

**Падставай для датэрміновага адклікання ўкладу могуць стаць нейкія трагічныя абставіны, якія закранулі самога ўкладчыка або яго сям'ю, калі тэрмінова патрэбны грошы.**

Першы намеснік старшыні праўлення Нацбанка звярнуў увагу, што ўладальнікі дзяржаўных каштоўных папер (як у беларускіх рублях, так і ў замежнай валюце) вызвалены ад аплаты падаходнага падатку. «Калі мы гаворым аб стварэнні фінансавай стабільнасці, то сёння было б нелагічна абкладаць нейкімі дадатковымі падаткамі самі інструменты кіравання дзяржаўным доўгам», — растлумачыў ён.

Што тычыцца даходаў па карпаратыўных аблігацыях (напрыклад, банкаў), то іх трымальнікі цяпер таксама валодаюць пэўнымі льготамі. Па такіх паперах сёння існуе льгота па падаткаабкладанні даходаў, якая дзейнічае да 1 студзеня 2016 года. «Цяпер абмяркоўваецца пытанне, каб пралангіраваць гэтую норму», — дадаў Тарас Надольны. На яго думку, для насельніцтва пытанне падаткаабкладання даходаў па карпаратыўных аблігацыях зараз менш адчувальна, бо гэты сектар запасычвае сродкі ў насельніцтва не вельмі актыўна і яго трэба развіваць», — растлумачыў ён.

## Доўгія зберажэнні — толькі пятая частка

Мэтай прыняцця дэкрэта №7 было стымуляванне доўгіх зберажэнняў. А задача атрымання дадатковага даходу ў бюджэт у выглядзе падатковых паступленняў не стаяла. «Мы зыходзілі з таго, каб прапанаваць механізм, які ўкладваецца ў ідэалогію сусветнай практыкі, дазваляе вырашыць пытанне раўнавання ўнутраных умоў падаткаабкладання і стымулюе пры гэтым доўгія зберажэнні», — адзначыў Тарас Надольны.

Спецыяліст расказаў, што доля ўкладаў на тэрмін, меншы за год, складае сёння каля 80% у структуры ўкладаў у беларускіх рублях. Адпаведна, на ўклады звыш года прыпадае 20%. Сярод дэпазітаў тэрмінам да года найбольш папулярныя ў беларусаў уклады «да трох месяцаў». Паводле ацэнак Нацбанка, яны складаюць амаль палову «хуткіх» укладаў у беларускіх рублях. Што тычыцца валютных укладаў, то тут дэпазіты да года складаюць каля 60%, а частка ўкладаў мае тэрмін і звыш двух гадоў.

Паводле слоў Тараса Надольнага, цяпер Нацбанкам вядзецца праца па зніжэнні інфляцыі, рэалізаваны механізмы, якія звязаны з таргетаваннем грашовай масы, вольным курсаўтварэннем. «Пытанне забеспячэння фінансавай устойлівасці і стабільнасці таксама застаецца актуальным. У сувязі з гэтым рэалізуецца шэраг мер, якія выяўляюцца, у прыватнасці, у прапанове канцэнтраваць функцыі мегарэгулятара фінансавага рынку ў руках Нацыянальнага банка», — дадаў ён.

## Адмоўнай рэакцыі Нацбанк не баіцца

Сапраўды, спецыялісты рэгулятара ў найбліжэйшыя дні не выключаюць таго, што частка насельніцтва можа і ўвогуле пачаць здымаць дэпазіты. Ніякіх забаронных мераў прымаць ніхто не будзе. «Наша ўмова: хоча чалавек забраць уклад — калі ласка. У банкаўскай сістэме сёння дастатковая ліквіднасць, каб вытрымаць падобныя ваганні. Аднак людзі хутка зразумеюць, што няма падставы губляць даходнасць праз магчымасць зняцця. Тады кліенты з грашыма пяройдуць у доўгія дэпазіты. Можа, іх аб'ём і не павялічыцца, але структура зменіцца. Банкі будуць зацікаўлены прапанаваць прадукт, які дазволіць прыцягнуць рэсурсы ў насельніцтва. Гэтая мера дазволіць запусціць і нейкія іншыя інструменты фінансавага рынку», — упэўнены Тарас Надольны.

## Улічыць міжнародны вопыт

Варта адзначыць, што падыходы да класіфікацыі банкаўскіх укладаў, прадугледжаныя дэкрэтам №7, цалкам адпавядаюць міжнароднай практыцы, як адзначаюць у Нацбанку. У многіх краінах свету распаўсюджана катэгорыя банкаўскіх укладаў, якія адрозніваюцца ад укладаў да запатрабавання. Агульным прынцыпам з'яўляецца неабходнасць узгаднення магчымасцяў і ўмоў датэрміновага вяртання ўкладаў паміж банкам і ўкладчыкам. Як правіла, укладчык можа забраць грошы да заканчэння тэрміну ўкладу, але закон не абавязвае банк вяртаць яго датэрмінова. Так, у Італіі, Фінляндыі, Францыі, Германіі магчымасць датэрміновага вяртання тэрміновых укладаў вызначаецца банкам і ўкладчыкам самастойна ў дагаворы. У Аўстрыі датэрміновае вяртанне тэрміновага банкаўскага ўкладу разглядаецца як крэдыт, за які выплачваюцца працэнты ад датэрмінова вернутай сумы за кожны поўны месяц, што застаецца да наступлення тэрміну вяртання ўкладу. У Вялікабрытаніі паняцце «тэрміновы банкаўскі ўклад» увогуле не ўжываецца, аднак заканадаўства не перашкаджае банкам узгадняць любыя тэрміны і ўмовы банкаўскіх укладаў, дзе прадугледжаны нават штрафы. Такім чынам, усе ўмовы і правілы павінны быць вызначаны і ўзгоднены ў кожным асобным дагаворы паміж банкам і ўкладчыкам.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ГОНАР ЗА ВЕТЭРАНАЎ

**Ігар ШУНЕВІЧ, міністр МУС РБ, павіншаваў праваахоўнікаў з Днём ушанавання ветэранаў органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў.**



Для многіх з іх, асабліва тых, хто служыў яшчэ ў часы Савецкага Саюза, 10 лістапада назаўжды застанецца святочнай датай, звязанай з Днём савецкай міліцыі. Так, сваё прафесійнае свята беларускія праваахоўнікі адзначаюць 4 сакавіка, але па традыцыі ў лістападзе яны разам з курсантамі, ветэранамі ўскладаюць кветкі да знака памяці генерала-палкоўніка Сяргея Бельчанкі, былога міністра ўнутраных спраў БССР; да помніка супрацоўнікам і вайскоўцам на вуліцы Камуністычнай у Мінску. Святочныя мерапрыемствы праходзяць ва ўсіх гарадах Беларусі.

— Мы заўжды ўскладаем кветкі, вянкі, і не толькі ў памятныя даты. Гэты помнік, дарэчы, узнік у 2003 годзе, — стоячы каля мемарыяла, кажа генерал-маёр у адстаўцы **Юрый РАДЗЮКЕВІЧ, былы намеснік міністра ўнутраных спраў.** — Ён прысвечаны супрацоўнікам унутраных спраў, ваеннаслужачым, якія працавалі пры савецкай уладзе, ваявалі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, змагаліся з бандытызмам, а таксама тым, хто, на жаль, у мірны час загінуў ад рук злачынцаў. І наша задача — памятаць пра іх, перадаваць іх імёны маладому пакаленню.

Былых супрацоўнікаў праваахоўных органаў аб'ядноўваюць не толькі ўспаміны, але дзейнасць ветэранскай арганізацыі, у якую ўваходзіць амаль 24 тысячы чалавек з 462 «пярвічак». Сярод іх — ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, удзельнікі баявых дзеянняў у Афганістане і ў іншых «гарачых кропках», ліквідатары наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС... Многія з іх прысутнічалі на святочным канцэрце.

— У гісторыі Міністэрства ўнутраных спраў нямала яркіх і сапраўды гераічных старонак, — звярнуўся да ветэранаў **Ігар ШУНЕВІЧ, міністр унутраных спраў.** — І мы ганарымся нашымі ветэранамі, сапраўднымі прафесіяналамі, — тымі, хто ў розныя гады годна выканаў свой службовы і воінскі абавязак, захаваў гонар мундзіра і сёння з'яўляецца ўзорам асабістай прыстойнасці і прынцыповасці. Вопыт такіх прафесіяналаў цанілі заўжды, яны дагэтуль складаюць моцны падмурак сістэмы ўнутраных спраў, унутраных войскаў Беларусі і застаюцца прыкладам для пераймання.

**Якаў ЖУРБІН.** *taras@zviazda.by*

## УВАГА, «ПРАМАЯ ЛІНІЯ»!



**14 лістапада, у суботу,**
у рэдакцыі газеты «Звязда» адбудзецца «прамая лінія» **з намеснікам міністра ўнутраных спраў — начальнікам міліцыі грамадскай бяспекі Мікалаем Аляксандравічам МЕЛЬЧАНКАМ.**

Пытанні, якія тычацца асабістай і маёмаснай бяспекі, своечасовага рэагавання на паведамленні аб правапарушэннях, прафілактыкі злачынстваў, аказання ахоўных паслуг, працы Дзяржаўтаінспекцыі, можна будзе задаць **з 10 да 12 гадзін** па тэлефоне **(8017) 2871871.** Папярэдне вы зможаце іх пакінуць па нумары **(8017) 2871751** альбо даслаць на электронную скрыню **taras@zviazda.by** з пазнакай «Прамая лінія».

## ЗАВОЧНАЯ «ПРАМАЯ ЛІНІЯ»

**Жывём з алергіяй**

Чаму ў адных імунная сістэма працуе добра, а іншых падводзіць? Што такое імунітэт і адкуль бярэцца алергія? Праблему алергіі — атапічнага дэрматыту, бранхіяльнай астмы і іншых захворванняў — можна абмеркаваць у рамках нашай **завочнай «прамой лініі» з галоўным пазаштатным дзіцячым алерголагам Міністэрства аховы здароўя, кіраўніком Рэспубліканскага цэнтра алергалогіі дзіцячага ўзросту, загадчыкам кафедры паліклінічнай педыятрыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктарам медыцынскіх навук, прафесарам Уладзімірам Фёдаравічам ЖАРНАСЕКАМ.**

Да **17 лістапада** пакідайце, калі ласка, свае пытанні па **нумары рэдакцыі 8 017 287 18 29** (Святлане Барысенцы) або дасылайце на **электронную пошту: info@zviazda.by**

# АДКРЫТЫ ФІНАЛ

**Ёсць такое паняцце ў кіно, калі карціна ўжо скончана, але тое, што будзе з героямі, застаецца за кадрам. Сёння, у апошні дзень фестывалю, ва ўсіх такі настрой — адкрытага фіналу, калі асноўныя мерапрыемствы ўжо прайшлі, але, як размяркуюцца галоўныя прызы, застаецца гадаць да самага вечара. Да таго моманту, калі рашэнне журы будзе абвешчана ў кінатэатры «Масква» падчас урачыстай цырымоніі закрыцця фестывалю.**



Тыя, хто збіраецца, павінны разумець: іх чакае нешта вельмі адмысловае. Таму што Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» адрозніваецца ад іншых вялікай колькасцю ўзнагарод і прызоў — іх размяркоўвае 7 складаў журы ў розных конкурсных праграмах. Але ёсць галоўныя: «золата» «Лістапада» — «За найлепшы фільм», «серабро» — «За фільм як з'яву мастацтва». І не менш цікава, каму глядачы прысудзяць «бронзу», таму што падчас усіх конкурсных паказаў кожны з глядачоў мог прагаласаваць асабіста. А далей усіх чакае фільм закрыцця «Новы запавет».

Асалода ў тым, што і на гэтым фестывальнае кіно не скончыцца: працяг будзе, прычым усе найбліжэйшыя выхадныя кінаманы змогуць яшчэ глядзець некаторыя фільмы з конкурснай праграмы і дадатковых, сярод якіх «Турэцкія далікатэсы», «Чалавечыя камедыі», «Прыватныя гісторыі», «Строга для кінаманаў», «Майстар-клас» і іншыя. Насамрэч, адмысловых праграм сёлета не проста шмат — іх безліч. Як жа не заблытацца і выбраць сваё кіно? Некаторыя нібыта «памечаны» для людзей, якія іх чакаюць: напрыклад, у праграме «Львы, мядзведзі і пальмавыя галінкі» прызначана сустрэча з Жакам Адзьярам — яго фільмам «Дзіпан», які быў узнагароджаны «Залатой галінай» на Канскім кінафестывалі ў 2015 годзе. Выбар у выхадныя багата — глядзець кіно прапануюць з раніцы да глыбокай ночы. Такім чынам, спадарства, фестываль скончаны, а свята працягваецца! Застаецца вывучаць праграму і шукаць квіткі ў продажы (а гэта не надта простая задача).

Усё свежае, новае, адметнае, што ёсць у сусветным кіно, ёсць магчымасць паглядзець на «Лістападзе», каб разумець, як развіваецца сусветны кінематограф. І каб лепш разумець свой, айчынны: на якім узроўні знаходзіцца цяпер ён, ці ёсць сілы для руху, дзе яны і ў кім? Разважаць ёсць пра што, аглядваючы конкурсную праграму (дзе ў чарговы раз не было беларускай карціны). Таму што асноўны конкурс ігравога кіно складаецца з новых фільмаў, якія ствараюцца ў краінах былога сацлагера, краінах СНД і Балтыі, Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Азіі, Усходняй і Цэнтральнай Еўропы. Кінажыццё віруе і адлюстроўвае змены рэчаіснасці, з якімі сутыкаюцца людзі. Аказваецца, можна ствараць годнае кіно пра жыццё і ва ўмовах абмежаванага бюджэту. Але, магчыма, гэта тады, калі ў кінамастацтва прыходзяць асобы. Дзеля іх пошуку, дзеля стымулу сёлета другі раз ладзіўся Нацыянальны конкурс, дзе прадстаўляліся беларускія карціны — ігравыя, дакументальныя, анімацыйныя. Беларускія — не значыць тыя, што абавязкова створаны ў Беларусі. Галоўнае, каб аўтары асэнсоўвалі сябе ў кантэксце беларускай культуры, адчувалі сваю прыналежнасць да яе. І, можа быць, некаторыя імёны стануць адкрыццямі для нас.

Дзеля таго, каб адкрыццяў у айчынным кіно было як мага больш, арганізатары фестывалю сёлета адкрылі новую «Індустрыяльную панэль». Для спецыялістаў у галіне кіно ці тых, хто толькі збіраецца паспрабаваць сябе як рэжысёр, прадзюсар, арганізатар кінавытворчасці, паказаў ці фестываляў. Усяму гэтаму цяпер можна павучыцца, не выязджаючы з Беларусі, таму што да нас запрашаюцца замежныя асобы, якія маюць вопыт працы і хочуць ім падзяліцца. Калі мы жадаем развіваць свой сучасны кінематограф, то варта было паслухаць пра новыя трэнды ў сучасным кіно, пра што, напрыклад, распавядалі Туе Сцін Мюлер ці Канстанцін Фам. Сіманэ Бауман і Наталля Дрозд былі запрошаны з вельмі актуальнай для Беларусі тэмай, як шукаць магчымасці для стварэння капрадукцый. Але адметны і прыезд у Мінск Мікалая Нікіціна, які адбірае фільмы для Берлінскага кінафестывалю, разумее крытэрыі і магчымасці для развіцця. З усіх навачвядзенняў менавіта гэтая лінейка, можа быць, аказалася найбольш карыснай з практычнага боку. Таму што адкрыла новыя магчымасці для адукацыі ў галіне кіно — гэта яшчэ адзін крок да развіцця кінематографа ў Беларусі, да яго будучыні.

**Ларыса ЦІМОШЫК.** *tsimoshyk@zviazda.by*

## ■ Не прапусціце!

### НАБЫВАЦЬ СА ЗНІЖКАМІ

**Універмагі сталіцы да канца месяца праводзяць распродажы тавараў са зніжкамі. Гэтая акцыя ўжо стартавала, паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.**

У ГУМе 19 лістапада дзіцячае адзенне, абутак, цацкі і канцылярскія тавары будуць каштаваць на 17 працэнтаў менш. 26 лістапада на нехарчовыя тавары гэты гандлёвы аб'ект дасць 20-працэнтную зніжку. 14 і 28 лістапада ўсе нехарчовыя тавары ў ЦУМе будуць каштаваць танней на 17 працэнтаў. На такую ж катэгорыю тавараў, але 20-працэнтныя зніжкі, будуць дзейнічаць у гандлёвым доме «На Нямізе» 18 і 25 лістапада, а ва ўнівермагу «Беларусь» — 17 і 24 лістапада. 15-працэнтныя зніжкі на ўсе нехарчовыя тавары будуць 18 і 25 лістапада ва ўнівермагу «Кірмаш».

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## ■ Клопат

# «ЧУЖЫХ ДЗЯЦЕЙ НЕ БЫВАЕ» —

## Гэты тэзіс пацвярджаюць амаль 18 тысяч беларускіх сем'яў

**«Закрываць штучна інтэрнатныя ўстановы для дзяцей-сірот у Беларусі ніхто не будзе», — у гэтым запэўніў журналістаў намеснік міністра адукацыі Віктар ЯКЖЫК, які прыняў удзел у адкрыцці першага Рэспубліканскага форуму замяшчальных сем'яў. Форум стаў пунктам адліку новага этапу ў развіцці сістэмы аховы правоў дзяцей і забеспячэння права кожнага дзіцяці на жыццё ў сям'і.**

— Грамадства ўжо ўсвядоміла, што калектыўная сістэма выхавання дзяцей, якія страцілі апеку бацькоў, не можа ў належнай ступені забяспечыць іх паспяховую сацыялізацыю. У такіх дзяцей адсутнічае імунітэт да негатыўных жыццёвых з'яў, затое нярэдка выпрацоўваецца спажывецкае стаўленне да сацыяльнай падтрымкі з боку дзяржавы. Усё гэта пераканала нас у тым, што дзіця павінна жыць і выхоўвацца ў сям'і. А значыць, дзяржава абавязана даць ім (там, дзе гэта рэальна) такую магчымасць, — патлумачыў пазіцыю свайго ведамства Віктар Якжык.

Намеснік міністра адукацыі паведаміў, што сёння на выхаванні ў сем'ях беларусаў знаходзіцца 24 535 дзяцей-сірот. На гэты момант у Беларусі налічваецца 45 дамоў-інтэрнатаў для дзяцей-сірот, але ў 2007 годзе іх было 70. Такім чынам, замяшчальныя сем'і (а іх цяпер налічваецца каля 18 тысяч) дазволілі закрыць у краіне амаль палову дзіцячых інтэрнатных устаноў. На 28 адміністрацыйных тэрыторыях 100% дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, перадаюцца на выхаванне ў замяшчальныя сем'і.

Асноўная частка дзяцей, якія па-ранейшаму выхоўваюцца ў дамах-інтэрнатах, маюць патрэбу ў асаблівай апецы. «У наступныя пяць гадоў мы, відома, плануем скарачаць колькасць інтэрнатных устаноў, але штучна фарсіраваць гэты працэс не будзем», — паабяцаў Віктар Якжык.

Разнастайнасць формаў уладкавання дзяцей на выхаванне ў замяшчальныя сем'і патрабуе ад спецыялістаў па ахове дзяцінства дыферэнцаванага падыходу. Але апекуны не заўсёды атрымліваюць спецыяльныя веды, неабходныя для выхавання дзяцей з нядобранадзейных сем'яў, у адрозненне ад усынавіцеляў або прыёмных бацькоў.

І суправаджэнне апякунскіх сем'яў на мясцовым узроўні часта абмяжоўваецца забеспячэннем сацыяльных гарантый дзецям-сіротам і не закранае пытанняў фарміравання педагагічных, псіхалагічных кампетэнцый апекуноў.

**«На гэты момант у Беларусі налічваецца 45 дамоў-інтэрнатаў для дзяцей-сірот, але ў 2007 годзе іх было 70».**

Па словах Віктара Якжыка, у сучасным свеце кардынальна змяніліся функцыі сям'і. Усё прагматычнае, што аб'ядноўвала сям'ю шмат тысячагоддзяў (наданне земельных надзелаў, зліццё бізнесаў, атрыманне ў спадчыну рамяства), паступова адыходзіць, а застаюцца тонкія матэрыі — такія, як псіхалагічныя спакой і пачуццё абароненасці. Сям'я становіцца тым месцам, дзе мы можам быць самімі сабой, дзе атрымліваем суцяшэнне і адчуваем сябе ў бяспецы. Такім чынам, асноўнае прызначэнне сям'і ў сучасным свеце — гэта эмацыянальная падтрымка ўсіх, хто жыве ў ёй.

— Развіццё сістэмы сямейнага ўладкавання і далей будзе арыентавацца на патрэбы дзяцей, якія маюць неабходнасць у гэтым відзе сацыяльна-педагагічнай абароны. Я шчыра ўдзячны ўсім прыёмным бацькам, бацькам-выхавальнікам, апекунам і ўсынавіцелям за клопат пра дзяцей. Тэзіс «чужых дзяцей не бывае» гэтыя людзі даказваюць на справе, — падкрэсліў Віктар Якжык. — І важна разумець, што справа гэтая патрабуе ад замяшчальных бацькоў не толькі душэўнага цяпла, але і ў пэўнай ступені сацыяльнай смеласці, асабістай сталасці, псіхолага-педагагічнай і прававой кампетэнтнасці.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## ВЕДЫ — НА ПРАКТЫЦЫ

**Івацэвіцкі ліцэй сельскагаспадарчай вытворчасці цяпер мае сваю суперсучасную малочнатаварную ферму.**

Рэканструкцыя былога жывёлагадоўчага аб'екта абышлася ў 23 мільярды рублёў. Затое цяпер навучэнцы змогуць атрымаць навыкі работы на абсталяванні, якім і аснашчаюцца новыя комплексы. Такім чынам, са сцен ліцэя выйдзе аператар машыннага даення, які зможа працаваць на ферме любога сельгаспрадпрыемства. І калі ў Івацэвіцкім раёне сучасная ферма толькі-толькі запушчана ў эксплуатацыю, то на базе Драгічынскага аграрна-вытворчага прафесійнага ліцэя яна паспяхова функцыянуе. Спалучэнне тэарэтычнага навучання з практычным ідзе на карысць справе.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

ОАО «**Белхим**» приглашает принять участие в процедуре переговоров на выполнение ремонта и наладки наружного оповещения территории предприятия Фанипольская база ОАО «Белхим» по адресу: **г. Фаниполь, ул. Заводская, 25.**

Предложения принимаются до **14:00 19.11.2015 г.** по адресу: **г. Минск, ул. Короля, 34, каб. №19.** Справки по тел. **8017 204-85-17**, факс **8017 204-85-19**, e-mail: *pto@belhim.by.*

УНП 100122846

# БЕСПРАЦОЎНЫМ — БЯСПЛАТНАЯ ПРАФЕСІЙНАЯ ПАДРЫХТОЎКА І ПЕРАПАДРЫХТОЎКА...

## На пытанні нашых чытачоў адказаў першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй ЛАБОВІЧ

**На мінулым тыдні ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны прайшла сумесная з газетай «Звязда» «прамая лінія» і анлайн-канферэнцыя Мінпрацы і сацабароны на тэму «Пытанні заработнай платы і занятасці насельніцтва». На званкі нашых чытачоў адказаў першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй Лабовіч. Найбольш актуальныя і цікавыя пытанні і адказы на іх — у нашай публікацыі.**



**— Добры дзень! Гэта вам тэлефаную Вікторыя з аграгарадка Любань, што ў Вілейскім раёне. Я хачу звярнуцца да вас з нагоды сваёй маці. Мая маці швачка, працавала, а ў апошні час атрымлівала дапамогу па доглядзе састарэлага. Зараз у яе няма працы, і яна стала на ўлік у цэнтр занятасці. Маме 54 гады. За тры месяцы ёй не прапанавалі ніводнай вакансіі. Па законе яе маглі б у такой сітуацыі ўжо адправіць на пенсію. Але не хочуць...**

— А колькі гадоў складае агульны стаж вашай маці?

**— 36 поўных гадоў.**

— І цяпер ёй 54 гады?

**— Так, 54 гады споўнілася ў ліпені. Пайшоў ужо 4-ы месяц, як яна стала на ўлік у цэнтр занятасці. Калі яна стала часцей тэлефанаваць, ездзіць, тады ёй далі два накіраванні. Яна з'ездзіла па гэтых накіраваннях, але вакансій там няма.**

— У адпаведнасці з дзейным заканадаўствам такія грамадзяне, як ваша маці, за год да наступлення пенсійнага ўзросту, маючы адпаведны стаж, маюць права на датэрміновае прызначэнне пенсіі...

**— Ёй адказваюць: так, мы можам адправіць вас на пенсію, але не абавязаны. Чакайце падыходзячых вакансій.**

— І падыходзячай працы ёй не прапанавалі?

**— Не, не прапанавалі, і, мяркуючы па ўсім, не прадбачыцца.**

— Добра, я вас пачуў. Міністэрства дасць даручэнне нашаму ўпраўленню ў Вілейцы, каб там дэтальна разгледзелі гэты выпадак.

* * *

**— Святлана Анатольеўна з Капыльскага раёна турбуе. У нас у ААТ «Цімiразеўскі» не выплачаны на сённяшні дзень заробак за верасень і дзіцячая дапамога за кастрычнік. Куды звяртацца?**

— Наконт нявыплаты заработнай платы вам неабходна звярнуцца ў адпаведнае структурнае падраздзяленне Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы па месцы рэгістрацыі вашага наймальніка. Усе адрасы структурных падраздзяленняў Дэпартамента пазначаны на сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Што тычыцца нявыплаты дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, то з гэтым пытаннем трэба звяртацца ва ўпраўленне Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва па месцы рэгістрацыі вашай арганізацыі ў якасці плацельшчыка абавязковых страхавых узносаў.

* * *

**— Мяне завуць Самусенка Валерый Паўлавіч, з Лагойскага раёна вам тэлефаную. Я працую ў бюджэтнай арганізацыі. І вось такое пытанне ў мяне: хацелася б даведацца, на якія мэты можа выкарыстоўвацца эканомія сродкаў, прадугледжаных на аплату працы работнікаў у бюджэтных арганізацыях?**



— Эканомія сродкаў, прадугледжаных на аплату працы, накіроўваецца на прэміраванне работнікаў, а таксама на ўстанаўленне павышальнага каэфіцыента да тарыфнай стаўкі (акладу).

* * *

**— Гэта Вавілаў Міхаіл, тэлефаную вам з Мінска. У мяне такое пытанне: раней прыводзілася, што беларусаў, якія працуюць за мяжой, — 700-800 тысяч чалавек. А колькі цяпер?**

— Па даных МУС, якое вядзе ўлік грамадзян рэспублікі, што выязджаюць для працы за межы Беларусі, за студзень—верасень гэтага года за межы рэспублікі на падставе падпісаных дагавораў і кантрактаў выехалі 5 311 чалавек.

Па звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта, у мінулым годзе за межамі Беларусі працавалі 61,6 тысячы чалавек.

Беларусы для часовага працаўладкавання выязджаюць пераважна ў Расію ў рамках дамоўленасцяў Саюзнай дзяржавы і Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе, якімі прадугледжана свабода руху працоўнай сілы. Нагадаю, што ў склад Еўразійскага эканамічнага саюза ўваходзяць Рэспубліка Беларусь, Рэспубліка Казахстан, Рэспубліка Арменія, Кыргызская Рэспубліка і Расійская Федэрацыя.

* * *

**— Гэта Надзея Паўлаўна з Мінска. Скажыце, калі ласка, ці можна беспрацоўнаму адмовіцца ад грамадскіх работ, якія аплачваюцца? Ці захавае ён пры гэтым статус беспрацоўнага? І што можа ў такім выпадку страціць?**

— Надзея Паўлаўна, удзел у такіх грамадскіх работах прапануецца ўсім беспрацоўным, каб маглі атрымаць даход у перыяд пошуку працы. Беспрацоўны мае права адмовіцца ад удзелу ў гэтых работах, пры гэтым статус беспрацоўнага захоўваецца, аднак неабходна ўлічваць, што ў адпаведнасці з артыкулам 25 Закона «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь» у выпадку невыкanання беспрацоўным без важных прычын месячнай нормы ўдзелу ў грамадскіх работах, якія аплачваюцца, выплата дапамогі па беспрацоўі прыпыняецца на тэрмін да трох месяцаў.

Удзел у аплачваемых грамадскіх работах не з'яўляецца абавязковым для наступных катэгорый грамадзян: бацькоў у шматдзетных і няпоўных сем'ях, а таксама сем'ях, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў; моладзі да 18 гадоў; інвалідаў; эвакуяваных і адселеных з зон эвакуацыі (адчужэння), першачарговага і наступнага адсялення, а таксама тых, хто самастойна выехаў з гэтых зон пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС; асоб перадпенсійнага ўзросту (за два гады да наступлення ўзросту, што дае права на пенсію па ўзросце на агульных падставах); а таксама для грамадзян, звольненых у сувязі з ліквідацыяй арганізацыі, спыненнем дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка, скарачэннем колькасці або штату работнікаў і зарэгістраваных у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне на працягу 12 месяцаў з дня звальнення, на працягу першых трох месяцаў з дня такой рэгістрацыі; для цяжарных жанчын; беспрацоўных, працаўладкаваных на часовыя работы з паведамленнем органам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

* * *

**— Трафімаў Мікалай з Маладзечна. Хачу пацікавіцца: прайсці перападрыхтоўку ад службы занятасці можа толькі афіцыйна зарэгістраваны беспрацоўны? Ці будзе ён атрымліваць стыпендыю? У якім выпадку ён можа яе пазбавіцца?**

— У адпаведнасці з заканадаўствам дзяржава гарантуе беспрацоўным бясплатную прафесійную арыентацыю, прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі з улікам грамадскіх патрэб і ў адпаведнасці са схільнасцямі, здольнасцямі, навыкамі і асаблівасцямі іх псіхафізічнага развіцця.

Беспрацоўны можа прайсці прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі ў выпадку, калі немагчыма падабраць прыдатную працу з прычыны адсутнасці ў яго неабходнай прафесіі або кваліфікацыі альбо неабходна змяніць прафесію (спецыяльнасць, род заняткаў) у сувязі з адсутнасцю працы, якая адпавядае наяўным у беспрацоўнага прафесійным навыкам.

У перыяд навучання па накіраванні органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне беспрацоўнаму выплачваецца стыпендыя ў памеры да трох базавых велічынь. Пры гэтым памер стыпендыі можа быць паменшаны на 25% тэрмінам на адзін месяц, альбо грамадзянін можа быць наогул пазбаўлены стыпендыі на такі ж тэрмін у выпадку непасляховасці, нерэгулярнага наведвання заняткаў без поўных прычын, пры парушэнні вучэбнай дысцыпліны і ўнутранага распарадку ўстановы адукацыі.

* * *

**— Вам тэлефануе Дзігалёў Мікалай Іванавіч, пенсіянер, інвалід 1 групы з Бабруйска. У мяне да вас два пытанні. Першае: мяне даглядае чалавек і атрымлівае за гэта дапамогу па доглядзе. А сацыяльны работнік атрымлівае зарплату. Гэта правільна? За адну і тую ж працу адзін атрымлівае дапамогу, а другі — зарплату. Я лічу, чалавек, які даглядае інваліда, таксама павінен атрымліваць зарплату, а не дапамогу. А як вы да гэтага ставіцеся?**

— Дапамога па доглядзе — гэта мера сацыяльнай падтрымкі працаздольных асоб, вымушаных пакінуць працу, каб даглядаць інваліда 1 групы або старога, які дасягнуў 80-гадовага ўзросту. У сувязі з гэтым такія людзі страцілі крыніцу сродкаў існавання. Але ў сілу сваёй спецыфікі догляд у выглядзе аказання пастаяннай дапамогі непрацаздольнаму ў ажыццяўленні надзённых патрэб не можа быць рэгламентаваны пэўнымі рамкамі, характэрнымі для працоўных адносін (працоўны час, час адпачынку і да т.п.). Таму ён не можа рэгулявацца працоўным заканадаўствам. Адпаведна на асоб, якія ажыццяўляюць пастаянны догляд, не распаўсюджваюцца нормы Працоўнага кодэкса.

**Наймальнік павінен праінфармаваць органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аб наяўнасці вакансій на працягу двух тыдняў з дня іх з'яўлення.**

Што тычыцца сацыяльных работнікаў, то яны знаходзяцца ў штаце тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Гэтыя работнікі аказваюць рознага роду сацыяльныя паслугі: бытавыя, медыцынскія і іншыя. Аднак забяспечыць неабходны пастаянны догляд непрацаздольным асобам, якія маюць патрэбу ў ім, сацыяльныя работнікі не могуць.

**— Добра, яшчэ адно пытанне. Вось скажыце, працуючы пенсіянер атрымлівае пенсію і зарплату. Але гэты ж пенсіянер чамусьці не мае права даглядаць інваліда або старога і атрымліваць за гэта дапамогу. Чаму ён не мае такога права?**

— Ажыццяўляць догляд інваліда ці састарэлага чалавека мае права любая асоба. Разам з тым у нашым заканадаўстве ёсць умова: атрымліваць дапамогу па доглядзе можна толькі пры адсутнасці іншай крыніцы даходу.

* * *

**— Вас турбуе Юркевіч Міхаіл з Пінска. Скажыце, калі ласка, як хутка звесткі аб свабоднай вакансіі павінны з'яўляцца ў службе занятасці?**

— Закон патрабуе, каб наймальнік пісьмова праінфармаваў органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аб наяўнасці свабодных рабочых месцаў (вакансій) на працягу двух тыдняў з дня іх з'яўлення — з указаннем умоў працы і памеру яе аплаты.

**— Дзякуй за адказ!**

— Усяго найлепшага!



Фота Надзеі БУЖАН.

**Святлана БУСЬКО.**

*busko@zviazda.by*

## Беларускае радыё: 90 гадоў у эфіры

**15 лістапада 1925 года адбылося ўрачыстае адкрыццё шырокавяшчальнай радыётэлефоннай станцыі. Упершыню ў эфіры прагучалі запаветныя словы: «Гаворыць Мінск!..». Быў наладжаны серыйны выраб радыёпрыёмнікаў, але трансляваць передачы маглі толькі ў радыусе 300 вёрстаў і гучалі толькі 30 хвілін на суткі. Так гісторыя пачыналася... А сёлета Беларускае радыё адзначае ўжо сваё 90-годдзе. Цяпер гэта сучасная высокатэхналагічная структура, якая ўключае ў сябе 2 агульнанацыянальныя каналы (Першы нацыянальны канал Беларускага радыё і радыё «Культура») і 3 радыёстанцыі («Сталіца», «Радыус-FM», міжнароднае радыё «Беларусь»). Напярэдадні юбілею мы сустрэліся з журналістамі, якія працуюць на радыё, і папрасілі іх падзяліцца сваімі ўспамінамі і разважаннямі пра эфірныя будні, урокі прафесіі, а таксама пагаварылі пра мінулае і сучаснасць у гісторыі Беларускага радыё.**

Алена ДАВІДОВІЧ, намеснік галоўнага дырэктара — дырэктар дырэкцыі інфармацыйнага і грамадска-палітычнага вяшчання Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё:

# «МІКРАФОН МОЖНА ПАРАЎНАЦЬ З РЭНТГЕНАМ»



***— Алена Анатольеўна, 90-годдзе — гэта значная падзея. З чым калектыў падышоў да такога рубяжа?***

— Калі коратка казаць, то Беларускае радыё сёння — гэта сучаснае радыё з багатымі традыцыямі. Як і раней, яно пазіцыянуе сябе як радыё для ўсіх і для кожнага. Слоган Першага нацыянальнага — «Будзем разам!». Яго мы выбралі свядома, і ён акрэслівае нашу мэту: заўсёды быць цікавым для слухача, разам з ім абмяркоўваць важнае, актуальнае і разам з карысцю праводзіць час.

Да 90-гадовага юбілею ў эфіры Першага нацыянальнага канала распачаты праект «Радыёлетапіс краіны», у якім мы звяртаемся да нашай багатай фанатэкі, архіўных запісаў, дзе можна пачуць галасы людзей розных часоў, успамінаем тых, хто працаваў у нас раней, расказваем і пра сённяшняе сучаснае радыё. Зразумела, разам з краінай Беларускае радыё расло, мянялася, мадэрнізавалася. Момантам адліку сучаснага радыё можна лічыць 90-я гады мінулага стагоддзя. Гэта новы час, новыя магчымасці.

***— Як змянілася радыё са з'яўленнем новых тэхналогій?***

— Мне здаецца, працаваць стала не толькі зручней, але, галоўнае, цікавей. Сучаснае радыё больш аператыўнае, мабільнае, інтэрактыўнае. Інфармацыю перадаём у рэжыме «тут і цяпер», большасць перадач — гэта жывы эфір. Я яшчэ застала той час, калі існаваў так званы плёначны мантаж, калі мы пісалі ўсё на вялікія магнітафоны з бабінамі, манціравалі плёнку з дапамогай нажніц і клею. А цяпер усё робіцца хутка на камп'ютары. Дзякуючы сучасным тэхналогіям журналіст можа аператыўна перадаць свой рэпартаж з любога месца падзей адразу ў эфір. Дарэчы, у 2006 годзе ў Доме радыё завершана мадэрнізацыя ўсіх студый і адбыўся поўны пераход на лічбавае вяшчанне. І сёння, напрыклад, Першы нацыянальны канал можна пачуць не толькі праз традыцыйныя крыніцы — па праваднай сетцы, на доўгіх і ўльтракароткіх хвалях, у FM-дыяпазоне, але і ў рэжыме рэальнага часу ў інтэрнэце і ў лічбавым стандарце DVB-T, прычым мы вяшчаем кругласутачна.

***— Што сёння неабходна, каб заставацца цікавымі для слухачоў?***

— У нас з'явіліся вяшчальныя сезоны. Кожны год у верасні мы абнаўляем сетку вяшчання на трацiну. Ёсць праграмы, якія сталі ўжо візітнай карткай Першага нацыянальнага, як, напрыклад, «Радыёфакт», дзе мы даём слухачу порцыю карыснай інфармацыі на пачатку дня, анансуем важныя падзеі, аналізуем актуальныя праблемы і сустракаемся з кампетэнтнымі суразмоўцамі. На працягу дня «Навіны» на канале абнаўляюцца штогадзінна. Увечары падводзім вынікі інфармацыйнага дня. У сетцы вяшчання Першага канала, як галоўнага інфармацыйнага і грамадска-палітычнага радыёканала Беларусі, знаходзіць адлюстраванне міжнародная, дзелавая, спартыўная, культурная інфармацыя, прысутнічае музычная, сацыяльная тэматыка, літаратурна-мастацкае вяшчанне. Радыё заяўляе пра сябе не толькі ў эфіры, але і па-за яго межамі. З 2003 года мы сталі актыўна праводзіць прома-акцыі, дабрачынныя мерапрыемствы. Новыя тэхнічныя магчымасці дазволілі выкарыстоўваць і новыя формы работы, пашыраць жанры рыдыёжурналістыкі. Радыёмасты з тэлерадыёкампаніямі розных краін сталі рэгулярнымі і шматпланавымі. Напрыклад, у рамках святкавання 70-годдзя Вялікай Перамогі мы правялі серыю радыёмастоў з гарадамі-героямі.

***— Якія творчыя якасці патрэбны сёння маладому журналісту, калі ён хоча працаваць на радыё?***

— Калі мне даводзіцца сустракацца з журналістамі-пачаткоўцамі або студэнтамі, якія прыходзяць да нас на практыку, то я перш-наперш для іх адзначаю, што мікрафон можна параўнаць з рэнтгенам. Таму што ён наскрозь «бачыць» чалавека, які сядзіць перад ім — і вядучага, і карэспандэнта, і госця. Радыёжурналісту трэба быць адказным за кожнае сваё слова ў эфіры. І памятаць, што гэтае слова павінна не проста прагучаць. Важна, каб яно было пачута слухачом і атрымала ў яго водгук. Сказаць, пачуць, адгукнуцца, быць сам-насам са сваім слухачом — мне здаецца, у гэтым нейкая сакральная сутнасць радыё. Мы існуем для слухачоў, працуем для іх і разам з імі ствараем Беларускае радыё. Таму зычу сваім калегам творчага ўздыму, крэатыву і моцнага здароўя. Няхай пашыраецца кола нашых слухачоў і няхай нашы словы заўсёды адгукаюцца ў іх сэрцах. А самому Беларускаму радыё жадаю быць заўсёды маладым і любімым!



**Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ, галоўны дырэктар міжнароднага радыё «Беларусь», радыёвядучы:**

— У маё жыццё радыё прыйшло вельмі рана. У дзяцінстве ў нас дома была чорная «талерка», якую любіла слухаць мая бабуля. Радыё ў нас не выключалася. І сам я слухаў казкі па радыё і нават, калі гуляў, браў кніжку і казаў: «Добры дзень, я вам зараз прачытаю казку». Але ніколі не думаў, што буду працаваць на радыё. Аднак так атрымалася, што на працу ў полацкую газету «Хімік» мяне не ўзялі, але запрасілі на вытворчае аб'яднанне «Палімір», і там была пасада «Рэдактар заводскага радыё». З таго часу я перад мікрафонам. Ужо тады, пазнаёміўшыся з радыйнай працай, прапанаваў свае паслугі Беларускаму радыё. А калі вызвалілася месца ўласнага карэспандэнта, то з 2 сакавіка 1981 года стаў працаваць на гэтай пасадзе на Беларускім радыё, і гэта доўжылася амаль 16 гадоў. Кожны дзень я павінен быў перадаваць сюды, на Чырвоную 4, тэкставую інфармацыю, рабіць рэпартажы... А з пераездам у Мінск, ужо працуючы ў часопісе «Вожык», я працягваў прыходзіць на радыё. Аднойчы мяне, як пісьменніка, запрасіла на інтэрв'ю Галіна Шаблінская. І вось я зайшоў у студыю і думаю: «Няўжо ніколі больш не сяду да мікрафона?». Таму, атрымаўшы ў 2002 годзе прапанову зноў працаваць тут, амаль што не раздумваючы, згадзіўся. Праз нейкі час мне прапанавалі ўзначаліць замежную рэдакцыю. За мяжой беларускае радыё ў той час вяшчала 4 гадзіны на 4 мовах. Для параўнання — сёння ў нас 8 моў і вяшчаем круглыя суткі. Апынуўшыся на пасадзе кіраўніка, я ні ў якім разе не хацеў пакідаць журналісцкую працу. Заўсёды трэба паказаць прыклад самому... Для мяне прыходзіць на радыё — гэта радасць.





**Ала РЫЖЭВІЧ, загадчыца аддзела інфармацыйных праграм радыё «Сталіца»:**

— Мая гісторыя на радыё пачалася 1 сакавіка 1993 года. 70-годдзе Беларускага радыё я сустракала тут і ўжо тады разумела, што гэта вельмі магутная структура. У маім жыцці з радыё звязаны амаль усе значныя падзеі: і асабістыя, і прафесійныя. Менавіта на радыё я некалі сустрэла будучага мужа (рабіла з ім інтэрв'ю ў такі ж асенні дзень 1995 года). І вось мы ўжо 20 гадоў разам, маем двух сыноў. І, магчыма, гэта самы вялікі падарунак «ад радыё» мне. Галоўны ўрок, які спасцігла на працы, — важна быць праўдзівым і шчырым, бо радыё мае спецыфіку: калі журналіст нешта кажа і гэта не супадае з тым, у што ён верыць і аб чым думае, то слухач усё адчувае. Мікрафон здольны раскрываць сутнасць чалавечага характару. Апошнім часам жыццё прымушае нас засяроджваць увагу на нейкіх сваіх асабістых праблемах, і ўсё радзей мы знаходзім магчымасць сустрэцца з кімсьці, паразмаўляць па душах. Радыё якраз дае шанц знайсці разумнага суразмоўцу.



**Уладзімір ТРАПЯНОК, загадчык аддзела навін культуры дырэкцыі канала «Культура» Беларускага радыё:**

— Я пачаў працаваць на радыё «Культура» ў 2003 годзе. Тады каналу споўнілася крыху больш за год. Я быў сведкам таго, як тут з'яўляліся новыя праекты, фарміравалася сетка праграм. Ведаю, што многія перадачы ўзнікалі пасля нашых творчых нарад. Цяпер «Культура» гучыць суткі ў эфіры і прапаноўвае слухачам самыя разнастайныя праграмы: культуралагічныя перадачы, чытанні беларускай і замежнай літаратуры, радыёспектаклі для дзяцей і дарослых, оперы, трансляцыі найлепшых канцэртаў Беларусі і Еўропы, навіны культуры і іншае — усё для духоўнага ўзбагачэння нашага слухача.

Мой педагог Уладзімір Рагаўцоў раіў: «Дай сабе ўстаноўку: я іду на эфір, быццам на свята!». Аднак варта памятаць, што ў эфіры мы нясём адказнасць за тых, хто нас слухае. Толькі людзі, якія разумеюць, што радыё для іх — гэта жыццё, тут застаюцца. Бо ў нас працуюць тыя, хто любіць канал «Культура», змест таго, што выпускаецца ў эфір.

**(Усе матэрыялы па гэтай тэме глядзіце на сайце zviazda.by)**

**Алена ДРАПКО.** *drapko@zviazda.by*

## АЎТОРАК, 17 ЛІСТАПАДА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.10** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.30** Зона Х.
**9.10, 22.05 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Добрае імя».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.10** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Зроблена ў СССР».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.40 Серыял «Зоя».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 23.50** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**0.25** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05, 22.15** «Арол і рэшка». Трэвел-шоу.
**10.05** Капейка ў капейку.
**10.30, 16.20 Трылер «Закрытая школа».**
**11.30, 0.00 Серыял «Косці».**
**12.30, 21.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**13.35, 19.05 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**15.30, 23.10** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**17.55 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**22.05** Спортлато 6 з 49. КЕНО.
**0.50 Серыял «У эфіры».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабраранак».
**7.40** «Сусветная карцінная галерэя».
**7.55, 11.05, 16.50, 0.05** «Калейдаскоп».
**8.10 «Чалавек на каленях». Драма.**
**9.55** «Гітара па крузе». Яўген Пальцаў, сцэнарыст, паэт.
**10.50** «Свет прыроды». Воўк па мянушцы Тэр.
**11.20, 17.05** «Размаўляем па-беларуску».
**11.25 «Чалавек з чорнай «Волгі». Драма.**
**13.05, 23.40** «Святло далёкай зоркі». Памяці акцёра Уладзіміра Кін-Камінскага.
**13.30 «Рыбная крама Ямаха». Драма.**
**15.05** Міжнародны фестываль Юрыя Башмета. П.І. Чайкоўскі «Яўген Анегін». Музычна-драматычная пастаноўка ў аўтарскай версіі Юрыя Башмета.
**17.10 «Сірано дэ Бержэрак». Драма.**
**19.00, 21.55 «Чырвонае і чорнае». Драма. 1—2-я серыі.**
**20.10, 23.15** «Дыя@блог». «Пра мову».
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Імпульс Алфёрава». Фільм першы «Сем дзён аднаго года».

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.25** PRO спорт. Вынікі.
**7.55** Час футбола.
**8.35** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Віцязь» (Маскоўская вобл.).
**10.30** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Астана» — «Цмокі-Мінск».
**12.10** Валейбол. Кубак выклікаў. Жанчыны. «Мінчанка» (Беларусь) — АЕК (Грэцыя).
**14.10** Самба. Чэмпіянат свету.
**15.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**16.15** Гандбол. SEHA-ліга. «Вайводзіна» (Сербія) — БГК імя Мяшкова (Беларусь).
**17.45** Спорт-кадр.
**18.15, 22.25** PRO спорт. Навіны.
**18.25** Футбол. Еўра-2017. U-21. Кваліфікацыя. Беларусь — Кіпр.
**20.30** Хакей. КХЛ. СКА (Санкт-Пецярбург) — «Авангард» (Омская вобл.).
**22.40** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. ЦСКА (Масква) — УНІКС (Казань).
**0.20** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.05, 16.20** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Вялікая».**
**22.50 Камедыя «Оптам танней».**
**0.35** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Меладрама «Салодкі лістапад».**
**10.40, 17.35** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!»
**13.50** «Наша справа».
**14.05** «Мае цудоўныя...»
**15.00, 23.40 «Халасцякі». Серыял.**
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**18.35** «Дакументальны праект»: «Дакрануцца да цуду».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.00** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**23.20** «Аўтапанарама».
**1.05** «Дакументальны праект»: «Энергія старажытных багоў».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Агульны інтарэс».
**9.30, 1.00 Маст. фільм «Справы сардэчныя».**
**11.15 Маст. фільм «Захоўвай яе, каханне».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 19.25 Серыял «Развод».**
**15.05** «Справы сямейныя».
**16.20** Дак. серыял «Іншы свет».
**16.50, 5.25** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**17.20 Серыял «Дашнікі».**
**21.10 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».**
**22.05 Маст. фільм «Пяць гадоў і адзін дзень».**
**23.55** Галоўная тэма.
**0.05** Ток-шоу «Слова за словам».
**2.30 Серыял «Мужчынская праца 2».**
**4.10 Маст. фільм «Сумленны, разумны, нежанаты».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.25, 23.50** «Прыватныя арміі. Бізнес на вайне». «Следчы эксперымент. Смяротны аўтограф».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Сямейны дэтэктыў».**
**19.00** «Наш чалавек».
**20.55 Серыял «Земскі доктар».**
**21.55, 23.10 Серыял «Людміла Гурчанка».**

### НТВ—БЕЛАРУСЬ

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05 Серыял «Адвакат».**
**7.10** «Новыя рускія сенсацыі».
**8.05** «Раніца з Юліяй Высоцкай».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.20 Серыял «Ляснік».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «Справа густу».
**14.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**16.20 Серыял «Ліцейны».**
**17.55** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Высокія стаўкі».**
**21.25 Серыял «Захоп».**
**23.20** «Анатомія дня».
**0.00 Серыял «Шаман».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 14.05, 19.40, 21.05, 23.50** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.45 Серыял «Злачынная імперыя».**
**8.30, 18.20 Серыял «Дэманы Да Вінчы».**
**9.35, 12.55, 13.50, 15.45, 16.40, 18.15, 19.25, 21.00** «Хатняя крама».
**9.45** Дакументальны экран.
**10.10** «Хобі + TV». Рэаліці-шоу «Свой фермер».
**11.10 Трылер «Ілюзія палёту».**
**12.45, 16.25** «Кінаблакнот».
**13.00 Серыял «Героі».**
**14.10 Серыял «Лавіна».**
**16.50 Серыял «Выкрадзеныя».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Трылер «Маўчанне ягнят».**
**23.25 Серыял «Турэцкая для пачаткоўцаў».**

### ВТБ

**6.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**6.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30, 16.00** «Турбаміксер».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00, 18.00, 23.30** Серыял «Святлафор 5».
**10.00, 14.00, 20.00** Серыял «Як я стаў рускім».
**11.00, 15.00, 19.00** Серыял «Лонданград».
**12.00** Меладрама «У чаканні вечнасці».
**13.50, 17.00** «Ералаш».
**17.30, 0.00** «Уральскія пельмені».
**21.10** Камедыя «Круіз».
**23.10, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.30** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Зачараваныя».
**4.00** «Лаві момант».
**5.00** «Рублёва — Бірулёва».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.20** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 0.10** «Адрынутыя». Серыял.
**12.15** «Эрмітаж».
**12.40** «Вышыня. Георгій Штыль». Дак. фільм.
**13.15, 23.40** Урокі рускай. Чытанні. Мікіта Міхалкоў чытае апавяданне Івана Буніна «Сонечны ўдар».
**13.40** «Расія маладая». Маст. фільм.
**14.50** «Томас Алва Эдысан». Дак. фільм.
**15.10, 20.45** «Жывое слова».
**15.50** Нашчадкі Гіпакрата. «Аляксандр Вішнеўскі. Асколак у сэрцы». Дак. фільм.
**16.15** Дакументальная камера. «Орсан Уэлс: стогадовы паядынак з часам».
**16.55, 21.30** «Карл Вялікі». Дак. фільм.
**17.55** Сусветныя зоркі скрыпічнага мастацтва. Юльян Рахлін.
**18.45** Жывы сусвет. «Пошукі вясёлкі».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Штучны адбор.
**22.20** «Гульня ў бісер». «О. Генры. Апавяданні».
**23.00, 1.40** «Сусветныя скарбы культуры».
**23.35** Мастсавет.
**1.00** «Твербуль, 25. Літаратурны інстытут імя А.М. Горкага». Дак. фільм.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Акулы пяра». Вадзім Казачэнка. 1997 год.
**6.40, 8.10, 9.00, 11.20, 13.05, 15.40, 17.00, 18.55, 21.40, 23.00, 1.00, 2.10, 5.00** Музычная настальгія.
**7.20** Фільм-канцэрт «Рабіна на каньяку». 1989 год.
**8.35** Дак. фільм «Эканоміка ў пошуках ісціны».
**10.00** Маст. фільм «Першы тралейбус».
**12.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Дыскатэкі 1980-х». 2005 год.
**13.20** Маст. фільм «Вясельны падарунак».
**14.45, 20.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**18.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Барыс Галкін. 2008 год.
**19.10** Маст. фільм «Размах крылаў».
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1985. 2-я частка. Паўтор ад 2010 года.
**1.20** «Галіна Вішнеўская. Вяртанне». 1992 год.
**2.45** Дак. фільм «Я пашыю Вам сукенку».
**3.00** «Быў час». 2008 год.
**4.00** Маст. фільм «Формула вясёлкі».

### EUROSPORT

**5.00, 10.30, 17.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры.
**7.00** WATTS!
**8.00, 13.30, 18.30, 1.15** Футбол. Кубак Еўропы. (U-21.)
**9.30, 10.25, 14.30, 15.25** Футбол. Еўрагалы.
**9.35, 14.35, 3.30** Футбол. MLS. Найлепшыя моманты.
**10.00, 15.00, 4.00** Футбол. Веліч футбола.
**12.00** Веласпорт. Гонка на трэку Revolution Series.
**13.00, 18.00, 22.00** Футбол. Тыдзень чэмпіянату MLS.
**15.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**16.15** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**22.30** Фігурнае катанне. Гран-пры Францыі. Найлепшыя моманты.
**0.10** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно.
**0.55** «За спінай».
**1.00** Акадэмія GT. Аўтаспорт.
**2.30** Лыжнае дваябор'е. Чэмпіянат свету. Найлепшыя моманты.

### КАМЕДЫЯ

**6.00** Камедыя «Шпіён па суседстве».
**7.45** Камедыя «Правадыр разнаскурых».
**9.30** Серыял «Вялікая школа».
**10.45** Камедыя «Паўднёвыя моры».
**12.25** Камедыя «Муж дзвюх жонак».
**14.00, 14.50, 15.40, 0.50** Скетч-шоу «Паміж намі».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (шоу)».
**16.00** Камедыя «Здзелка».
**17.40, 22.00** Серыял «Шчаслівыя ў разводзе».
**18.30** Камедыя «Кактус».
**20.20** Камедыя «Укол парасонам».
**23.10** Меладрама «Каханне без парасадак».
**1.15** Меладрама «Нявеста з таго свету».
**3.00** Серыял «Пэт і Кэбедж».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.40** «Доктар І...»
**8.10, 18.50, 1.15** «Гісторыя кахання». Серыял.
**10.00, 3.40** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.50, 4.25** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**11.45** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.35** «Сакрэты экстрасэнсаў». Дак. серыял.
**13.30, 17.55** «Тайны следства». Серыял.
**14.25** «Простыя складанасці».
**14.55** «Рокіно».
**15.05, 2.55** «Нераскрытыя тайны».
**16.00** «Мой герой».
**16.50, 21.50** «Пётр Першы. Завяшчанне». Серыял.
**20.50, 0.30** «1943». Серыял.
**22.50, 5.15** «Зорныя гісторыі».
**23.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### TV 1000 ТБ1000

**6.00, 16.15** Баявік «Прывідны гоншчык».
**8.00** Драма «Валодаючы табой».
**9.35, 1.20** Фэнтэзі «Гары Потэр і Кубак Агню».
**12.10, 4.10** Драма «Не злоўленыя, не злодзей».
**14.20** Камедыя «Кухар на колах».
**18.20** Камедыя «Аналізуй тое».
**20.00** Камедыя «Starперцы».
**21.50** Прыгоды «Падарожжа да Цэнтра Зямлі».
**23.30** Трагікамедыя «Шукаю сябра на канец свету».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Меладрама «Марафон».
**8.10** Камедыя «Вечнае вяртанне».
**10.00** Драма «Алеся».
**11.30** Камедыя «Пра што маўчаць дзяўчаты».
**13.00** Камедыя «Саламяны капялюшык».
**15.20** Камедыя «Тата напракат».
**17.00** Камедыя «Вясёлая моладзь».
**18.40** Баявік «Спіраль».
**20.20** Меладрама «Падарожжа з хатнімі жывёламі».
**22.10** Маст. фільм «Яраслаў. Тысячу гадоў назад».
**0.10** Драма «Гамлет. XXI стагоддзе».
**2.35** Дэтэктыў «Сышчык Пуцілін. Князь ветру».
**4.50** Маст. фільм «Небяспечныя гастролі».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 10.10, 14.25, 20.10** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**6.50** Займальная навука.
**7.15** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40** Прарыў.
**8.30** Конкурс аўтамабіляў будучыні.
**9.20, 13.30, 19.20** Непаражальныя канструкцыі.
**11.00** Мегазаводы.
**11.50** Ледзяная дарога.
**12.40** Незвычайныя промыслы.
**15.10** Дзікая прырода Расіі.
**16.00** Гісторыя жывёльнага свету.
**16.50** Гульні розуму.
**17.40, 21.50, 2.00, 5.15** Як перамагчы ва ўсім.
**18.30, 2.50** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**21.00 1.10, 4.30** Шырокі погляд.
**22.40, 3.40** НЛА над Еўропай.
**23.30** Эвакуацыя Зямлі.
**0.20** Расследаванні авіякатастроф.

### DISCOVERY

**8.00, 12.30** Хуткія і гучныя.
**8.50** Не спрабуйце паўтарыць.
**9.45, 14.20, 21.30** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.45, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.40, 17.05** Бітвы за кантэйнеры.
**11.35, 7.10** Рыбацкія легенды.
**13.25, 6.25** Што было далей?
**15.15, 1.00, 5.35** Круты цюнінг.
**16.10, 23.00, 3.00** Махінатары.
**18.00** Голыя і напалоханыя.
**20.00** Падарожжа ў невядомасць.
**22.00** Мяцежны гараж.
**0.00** Кубінскі хром.
**2.00, 4.50** Іржавая імперыя.
**4.00** Маланкавыя катастрофы.
**4.25** Сапраўдныя аферысты.

# НОВАЯ ВЕРСІЯ «ЧАРАЎНІЦТВА»

## для прыхільнікаў «Еўрабачання»

**У рамках падрыхтоўкі да міжнароднага дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2015» афіцыйны прадстаўнік нашай краіны Руслан Асланаў прэзентаваў два відэакліпы на конкурсную кампазіцыю «Чараўніцтва».**



Напярэдадні ад'езда ў Сафію, дзе 21 лістапада пройдзе грандыёзны музычны форум, беларускі ўдзельнік парадаваў сваіх прыхільнікаў і фанатаў «Еўрабачання» акустычнай версіяй песні "Чараўніцтва" на англійскай мове. Прэм'ера новай версіі кампазіцыі і арыгінальнага відэа для інтэрнэт-аўдыторыі адбылася днямі на сайце Белтэлерадыёкампаніі.

13 лістапада на тэлеканале «Беларусь 1» у праграме «Добрай раніцы, Беларусь!» запланавана прэм'ера відэакліпа Руслана Асланава на конкурсную песню. Здымкі яго праходзілі напрыканцы кастрычніка. Па задуме рэжысёра Ганны Герт, дзеянне ў кліпе адбываецца ў двух часавых вымярэннях: рэальнасць мяжуе з чараўніцтвам. Першую сюжэтную лінію здымалі ў Мінску, а на другі дзень гарадскія пейзажы змяніліся прыроднымі, і здымкі працягваліся на вясковым полі і ў лесе. У святле флюарэсцэнтных лямпаў яны набылі магічны выгляд. Пасля афіцыйнай прэзентацыі відэа будзе даступна на сайце дзіцячага «Еўрабачання» junioreurovision.tv і на сайце галоўнага медыяхолдынга tvr.by.

У канчатковым варыянце песні апошні прыпеў Руслан выконвае на англійскай мове. Дарэчы, у Балгарыю наша дэлегацыя возьме з сабой промапрадукцыю, у тым ліку дызайнерскі буклет, таксама спецыяльна распрацаваны Ганнай Герт. У камплект уваходзіць дыск з конкурснай кампазіцыяй у новай аранжыроўцы. У Сафію адправяцца і падарункі для ўсіх удзельнікаў конкурсу і арганізатараў з ЕВС. Адкрытае акцыянернае таварыства «Мінскі гадзіннікавы завод», які на працягу некалькіх гадоў з'яўляецца нязменным партнёрам дзіцячага і дарослага конкурсаў «Еўрабачанне», прадстаўляе пяцьдзесят гадзіннікаў з дзіцячай калекцыі ў якасці прэзентацыйнай прадукцыі для тых, хто ўзначальвае дэлегацыі, а таксама для канкурсантаў, міжнародных каментатараў і функцыянераў ЕВС, што забяспечваюць трансляцыю конкурсу.

Касцюм, у якім наш выканаўца выйдзе на сцэну «Еўрабачання», а таксама касцюм для індывідуальных рэпетыцый і курткі для членаў афіцыйнай дэлегацыі стварыла кампанія MARUSYA. У Сафію наш артыст і яго каманда, у склад якой уваходзяць і прадстаўнікі Белтэлерадыёкампаніі, адправяцца 14 лістапада.

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*

■ Zамор'е

# «ЗАПОЙНЫ ПРАГЛЯД» І ІНШЫЯ НОВЫЯ СЛОВЫ

**Брытанскі слоўнік англійскай мовы Collins English Dictionary назваў словам года дзеяслоў to binge-watch — «запойна праглядаць тэлепраграмы». Пра гэта і іншыя новыя словы года паведамляецца на сайце слоўніка.**



Відэасэрвісы за апошнія гады кардынальна змянілі звычкі тэлегледачоў — праз магчымасць паглядзець у сеціве прапушчаную серыю любімага серыяла (або ўвесь серыял цалкам) выпадкі ўжывання слова «запойны прагляд» выраслі на 200 % у параўнанні з 2014 годам.

Іншым важным словам складальнікі слоўніка назвалі «чыстоедение» (clean-eating), адзначыўшы, што дзякуючы блендару NutriBullet, шматлікім кулінарным кнігам і тэлешоу дыета з «чыстых» (арганічных і вегетарыянскіх прадуктаў) стала вельмі папулярная ў Вялікабрытаніі.

Шматлікія разводы і раставанні славутасцяў у 2015 годзе прымусілі лексікографаў адзначыць словы ghosting («ператварацца ў прывід» — не адказваць на тэлефонныя званкі і электронныя лісты) і to swipe — «свайпіць», у сэнсе ўхваляць або адхіляць профілі патэнцыйных сексуальных партнёраў на Tinder і падобных яму сэрвісах.

Акрамя таго, навукоўцы адзначылі словы dadbod («крыху азызлы, але ўсё яшчэ прывабны мужчына»), manspreading («сядзенне з шырока расстаўленымі каленямі ў грамадскім транспарце, незручнае для навакольных»), shaming («негатыўнае каментаванне чужых профіляў і фота ў сацсетках» — частата ўжывання слова ў 2015-м вырасла ў тры разы), contactless («бескантактны») і transgender («трансгендарны»).

У 2014 годзе Collins English Dictionary назваў словам года дзеяслоў photobomb («з'яўляцца на фотаздымку без ведама суб'екта»).

# РОБАТЫ ЖЭНЯЦЬ ЛЮДЗЕЙ

**У кітайскім горадзе Цяньцзінь вяселле, якое прайшло ў пачатку лістапада, дапамог згуляць робат.**



Машына ў сукенцы і галаўным уборы са штучных кветак падчас святочнай цырымоніі падвезла маладым пярсцёнкі і зачытала ўрачыстыя пажаданні. Распрацаваны мясцовай тэхнакампаніяй Tianjin R&D робат быў задуманы ў першую чаргу як робаафіцыянт, але распрацоўшчыкі вырашылі, што на сваім падносе ён можа дастаўляць не толькі закускі. На думку мясцовай прэсы, за робатамі-памочнікамі на вяселлях — будучыня, бо іх паслугі будуць абыходзіцца танней, чым праца людзей, якія вядуць вясельныя цырымоніі.

**Іван Купарвас.**
hvir@zviazda.by

## НЯДЗЕЛЯ, 22 ЛІСТАПАДА

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.20 Камедыя «Палюбоўнік для Люсі».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.40** Гісторыі рамонту.
**10.25** «50 рэцэптаў першага».
**11.05** XXL WOMAN TV.
**11.45** Нашы.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** Каробка перадач.
**13.10** Зона Х. Вынікі тыдня.
**13.40** Тайны следства.
**14.15** Вакол планеты.
**15.15** Твой горад.
**15.30 Меладрама «Карункі».**
**17.25 Меладрама «Ілюзія шчасця».**
**21.00** Галоўны эфір.
**21.55** Клуб рэдактараў.
**22.35** Навіны надвор'я.
**22.55 Меладрама «Я падару табе каханне».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.05** М/с «Сябры анёлаў».
**8.05 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».**
**10.05** «Арол і Рэшка. Нязведаная Еўропа». Трэвел-шоу.
**11.05, 23.25** Хачу ў тэлевізар!
**11.15, 20.05** Тэлебарометр.
**11.20** Ваша лато.
**11.50** Пяцёрачка.
**12.25** «Зразумець і абясшкодзіць».
**13.00 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**15.00 Баявік «Тры ікс».**
**17.05 Фантастыка «Раён № 9».**
**19.15** Суперлато.
**20.40** Кіпень.
**21.10 Дэтэктыў «Метад Фрэйда 2».**
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.30 Меладрама «Іншаземка».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 17.50, 0.10** «Калейдаскоп».
**8.15, 22.05 «Нестар Бурма». Серыял.**
**9.45** «Экіпаж». Фільм-катастрафа.
**12.00** «Подых струн». Музычная праграма. Народны калектыў аўтарскай песні «Элегія» (г. Вілейка).
**12.45** «Наперад у мінулае».
**13.10** Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
**14.05** «Музеі Беларусі». Мемарыяльны музей Героя Савецкага Саюза К.С. Заслонава.
**14.35** «О Беларусь, мая шыпшына!». Дак. фільм.
**15.00** «Гітара на крузе». Віктар Фёдараў-Вішнякоў, акцёр, заслужаны артыст Расіі, скрыпачка Таццяна Хазанава.
**15.55 «Апошняе каханне містара Моргана». Драма.**
**18.05 «Дванаццаць крэслаў». Камедыя.**
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Любімыя ВІА». Канцэрт з удзелам папулярных ВІА 70-х, 80-х гадоў.
**23.35** Леанід Млечын прадстаўляе. «Сусветныя тайны». «Мікалай ІІ, Аляксандра Фёдараўна і Грыгорый Распуцін». Дак. фільм.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.35, 23.15** PRO спорт. Навіны.
**7.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Ліverпуль».
**9.45** Баскетбол. Кваліфікацыя да Еўра-2017. Жанчыны. Польшча — Беларусь.
**11.25** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. БГК імя Мяшкова (Беларусь) — «Татран» (Славакія).
**12.55** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**13.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**14.05** Мотафрыстайл. Мотаэкстрымфэст 35х15.
**15.10** Баскетбол. НБА. «Арланда» — «Сакрамента».
**16.55** Хакей. КХЛ. «Віцязь» (Маскоўская вобл.) — «Дынама» (Мінск).
**19.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Тотэнхэм» — «Вест Хэм».
**21.05** Таэквандо. Адкрыты кубак СНД — Кубак свету ITF.
**23.30** Баскетбол. НБА. «Кліперс» — «Таронта».

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** «Нядзельная прапаведзь» (з субцітрамі).
**9.20** М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
**9.35** «Бесталковыя нататкі».
**9.55** «Пакуль усе дома».
**10.40** «Фазэнда».
**11.15** «Брэйн-рынг».
**12.25 Серыял «Назад у СССР».**
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Тэорыя змовы».
**17.25** «КВЗ-2015». Кубак мэра Масквы.
**20.00** Контуры.
**21.05** «Голас».
**23.20 Толькі для дарослых. Трылер «Метад». Сеанс пяты.**

### СТБ

**6.20 «Афрамасквіч». Серыял.**
**7.10** «Скардзіцца дазваляецца».
**7.30, 16.50** «Аўтапанарама».
**7.55 Трылер «Тэорыі змовы».**
**10.15** «Чыстая праца».
**11.00** «Вялікае снеданне».
**11.40 «Салдаты 6». Серыял.**
**13.30, 16.30** «24 гадзіны».
**13.40, 0.20 Маст. фільм «Мост Ватэрлоа».**
**15.35** «Батальён памяці».
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**17.20** «Дарагая перадача».
**17.30 Драма «Кіроўца для Веры».**
**19.30** «Тыдзень».
**20.25** «Ваенная тайна».
**22.40** «Замуж за ІДІЛ». Дакументальны спецпраект.

### МІР

**6.00** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**6.15** М/ф.
**6.50 Маст. фільм «Айбаліт-66».**



**8.35** «Ведаем рускую».
**9.30, 5.20** «Нітка да ніткі».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Іншыя».
**11.05 Серыял «Бацькоўскі інстынкт».**
**14.15 Маст. фільм «Індыга».**
**16.15, 22.00 Серыял «Усё дзеля цябе».**
**21.00** «Разам».
**0.25 Маст. фільм «Парыж! Парыж!».**
**2.40** Дак. фільм «З нагоды» Станцуй сваё жыццё.
**3.35 Маст. фільм «Вясёлая моладзь».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Пакой смеху».
**7.40 Маст. фільм «Зламаныя лёсы».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
**12.40** «Ранішняя пошта».
**13.20** «Ха». Маленькія камедыі.
**14.15** «Пакой смеху».
**14.40 Маст. фільм «Крывое люстэрка душы».**
**18.00** «Усерасійскі адкрыты тэлевізійны конкурс юных талентаў «Сіняя Птушка».
**20.00** Весткі тыдня.
**21.30** Ток-шоу «Што адбываецца».
**22.30 Маст. фільм «Ала ў пошуках Алы».**
**0.20** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10, 8.20 Серыял «Адвакат».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Ядзім дома».
**10.25** «Першая перадача».
**11.00** «Цуд тэхнікі».
**11.50** «Дачны адказ».
**13.20** «Паедзем, паядзім!»
**14.05** «НашСпажыўНагляд». Не дай сябе падмануць!
**15.00, 16.20 Серыял «Час Волкава».**
**18.00** «Акцэнты тыдня».
**18.55** «Кропка».
**19.45 Серыял «Павуцінне».**
**23.15** «Прапаганда».
**23.45** «Уласны гонар».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 12.40, 19.00, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** Мультпарад.
**10.00** «Адшукваецца адпачынак».
**10.30, 14.25, 16.10, 20.55** «Хатняя крама».
**10.45 Камедыя «Знаёмства з Факерамі».**
**12.45 Камедыя «Знаёмства з Факерамі-2».**
**14.35** М/ф.
**16.40 Серыял «Каломба».**
**18.00** «Хобі + TV». Рэаліці-шоу «Свой фермер».
**19.05 Фантастыка «Нешта».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Вестэрн «Заклінальнік коней».**

### ВТБ

**6.00** «Хатняя кухня».
**6.30** «Вялікая маленькая зорка».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**7.45** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.00** «Ералаш».
**9.00** Серыял «Вароніны».
**10.00, 1.00** «Турбаміксер».
**12.00** Серыял «Кухня 5».
**14.30** Серыял «Апошні з Магікян».
**16.00** «Дзікія гульні».
**17.00, 23.15, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**17.15** Трылер «Стукач».
**19.30** «Уральскія пельмені».
**21.00** Фантастыка «Вобласці цемры».
**23.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.00** «Кіно ў дэталях».
**3.30** «Лаві момант».
**4.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**5.00** Серыял «Свацці».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.35** «Апошні дзюйм». Маст. фільм.
**12.05** «Легенды сусветнага кіно». Дэвід Грыфіт.
**12.30** «Расія, любоў мая!» «Алтай. Свет гукаў і фарбаў».
**13.00** «Унікальныя Галапагоскія астравы. Паўднёвая Амерыка». Дак. фільм.
**13.55** Геніі і ліхадзеі. Гай Севярын.
**14.25** «Што рабіць?»
**15.15** «Пешшу...» Масква Станіслаўскага.
**15.45** «Кардэбалет». Маст. фільм.
**17.40, 1.55** «Шукальнікі». «Асуджаны на змову».
**18.30** «Нашых песень дзіўнае жыццё». Канцэрт бардаўскай песні ў Дзяржаўным Крамлёўскім палацы.
**19.30** Да юбілею кінастудыі імя М. Горкага. «100 гадоў пасля дзяцінства».
**19.45** «Бацькава хата». Маст. фільм.
**21.20** «Люсьена Аўчыннікава. Матылёк». Дак. фільм.
**22.00** Паслухайце!.. «Паэты вайны».
**23.20** Да 90-годдзя з дня нараджэння вялікай балерыны. Мая Плісецкая, Аляксандр Багатыроў у легендарным балеце Вялікага «Лебядзінае возера».
**1.25** «Гісторыя аднаго злачынства». «Лаўка». М/ф для дарослых.
**2.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00, 12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1987. Уладзімір Жырыноўскі. Паўтор ад 2010 года.
**7.00, 8.25, 9.40, 11.00, 14.20, 13.00, 15.40, 17.15, 18.40, 20.05, 21.25, 23.35, 0.55, 2.30, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.30** Дак. фільм «Дысідэнты».
**8.45, 2.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
**9.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00** «Колба часу».
**13.30** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Андрэй Міронаў.
**15.00** «Быў час». 2008 год.
**16.00** Маст. фільм «Цягнік паза раскладам».
**18.00** «Акулы пяра». Анатоль Крупноў. 1997 год.
**19.10** «Барыс Грабеншчыкоў і яго група «Акварыум». 1990 год.
**20.30** Дак. фільм «Францыя, песня...».
**22.00** Маст. фільм «Горад з раніцы да поўначы».
**0.00** «Спяем, сябры!» з Тацццянай Візбар. Вайханскія Галіна і Барыс. 2008 год.
**1.20** Маст. фільм «Асаблівая думка».
**4.00** «Народжаныя ў СССР».

### EUROSPORT

**5.00, 7.30, 10.30, 14.30, 21.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**6.00, 11.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
**8.30** WATTS!
**9.00** Футбол. Еўрагалы.
**9.05** Футбол. MLS. Найлепшыя моманты.
**9.30** Футбол. Лаціна.
**10.00** Футбол. ФІФА.
**10.25** Футбол. Сусветны футбол.
**13.00, 0.00, 3.00** Футбол. Тыдзень чэмпіянату MLS.
**17.45** Фігурнае катанне. Гранпры Расіі.
**19.45, 20.55** Конны спорт. «Перавага коней».
**19.50** Конны спорт. Кубак свету.
**20.45** «Час скачак».
**22.30, 1.00, 3.30** Футбол. Чэмпіянат MLS. Плэй-оф.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 17.40, 22.00, 3.00** Серыял «Шчаслівыя ў разводзе».
**6.50** Меладрама «Дзённік кар'ерысткі».
**8.25** Камедыя «Карсіканец».
**10.45** Камедыя «Матулі».
**12.20** Камедыя «Вучань Дзюкабю».
**14.00** Меладрама «Шчаслівае сямейства».
**15.40, 0.50, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Меладрама «Сама па сабе».
**18.30** Камедыя «Канікулы Дзюкабю».
**20.20** Меладрама «Іронія кахання».
**23.10** Камедыя «Улётны рэйс».
**1.15** Меладрама «Даю год».
**4.00** Меладрама «Ажаніся на першай сустрэчнай».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.35** «Дачныя гісторыі».
**10.00, 5.15** «Нераскрытыя тайны».
**10.55** «Паненка і кулінар».
**11.30, 0.55** «Класныя мужыкі». Серыял.
**14.55** «Жонка. Гісторыя кахання».
**16.20** «З нябёсаў на зямлю». Маст. фільм.
**19.35** «Без падману».
**20.25** «Каўбоі супраць прышэльцаў». Маст. фільм.
**22.55** «Асцярожна, махляры!»
**23.25** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**3.55** «Так рана... Так позна». Дак. фільм.

### ТБ1000

**5.40** Камедыя «Узъяднанне сям'і Мэдэі».
**7.30** Меладрама «Бурлеск».
**9.30** Драма «Джобс: Імперыя спакусы».
**11.35** Баявік «Напруж звіліны».
**13.25** Драма «На самым дне акіяна».
**15.15** Фэнтэзі «Гары Потэр і Кубак Агню».
**17.50** Драма «Марыя — каралева Шатландыі».
**20.00** Фантастыка «Дывергент».
**22.20** Фантастыка «2012».



**1.00** Трылер «Самы небяспечны чалавек».
**3.00** Драма «На самым дне акіяна».
**4.50** Меладрама «Свята вакол».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Дэтэктыў «Сышчык Пуцілін. Касцюм Арлекіна».
**8.10** Дэтэктыў «Сышчык Пуцілін. Князь ветру».
**10.25** Дэтэктыў «Сышчык Пуцілін. Дом спатканняў».
**12.10** Драма «Ганна і камандор».
**13.40** Драма «Гамлет XXI стагоддзе».
**16.10** Драма «Дуброўскі».
**18.30** Меладрама «Падарожжа з хатнімі жывёламі».
**20.20** Камедыя «Змяшаныя пачуцці».
**22.10** Баявік «Спіраль».
**23.55** Камедыя «Вясёлая моладзь».
**1.30** Меладрама «Жаніх па аб'яве».
**3.10** Камедыя «Дэжа вю».
**4.55** Драма «Снайпер: апошні стрэл».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 12.40** Мегазаводы.
**6.50** Займальная навука.
**7.15, 9.00** Навуковыя недарэчнасці.
**8.00** Узлом Сістэмы.
**8.30** Код небяспекі.
**9.20** Асветленая багна.
**10.10** Голая навука.
**11.00, 20.10, 0.20, 3.40** Навука будучага Стывена Хокінга.
**11.50** Космас: Прастора і час.
**13.30** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**14.20** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**15.10** Па тонкім лёдзе.
**16.00** Тайвань: востраў рыбы.
**16.50** Асушыць акіян.
**17.40** Зона 51: Сакрэтныя файлы ЦРУ.
**18.30** Чалавек супраць YouTube.
**21.00, 1.10, 4.30** Прарыў.
**22.40** Аперацыя на мозгу ў прамым эфіры.
**23.50** Гульні розуму.
**2.50** Эвакуацыя Зямлі.

### DISCOVERY

**8.00** Стальныя хлопцы.
**8.50, 21.00, 4.00** Голыя і напалоханыя.
**10.40, 17.05** Падарожжа ў невядомасць.
**11.35** Як уладкаваны Сусвет.
**12.30** Нябачныя светы.
**13.25, 4.50** Цуды Сусвету.
**14.20, 22.00** Не спрабуйце паўтарыць.
**15.15, 23.00** Разбуральнікі легенд.
**16.10, 0.00** Трой.
**17.05, 2.00, 5.35** Акулы аўтатаргоў з Даласа.
**20.00** Драпежнікі буйным планам.
**1.00** Мяцежны гараж
**3.00** Хуткія і гучныя.

■ Простая мова

# ПРЫКЛАД, ВАРТЫ ПЕРАЙМАННЯ

**...Галава — што той аэрапорт: нешта пастаянна вылятае! Прылятае, зразумела ж, таксама, але вылетаў чамусьці больш.**

## ШТО ЁСЦЬ...

Добра школьнікам: два месяцы адвучыліся — могуць адпачыць.

Сямігадовая Волечка, напрыклад, сваё першыя вакацыі на волі правяла: у вёсцы, на бабуліных падушках адаспалася, яе ж блінамі ад'елася, з сабакам ды катом нагулялася, на кані з дзядулем накаталася і, вядома ж, новых слоў «нахапалася»...

— Вушкі я не люблю мыць, — прызналася маме, прыехаўшы дамоў, — бо яны ў мяне такія пакручастыя...

Каб сустрэць, каб знайсці гэта слоўца сярод безлічы іншых, можна, згадзіцеся, перабраць, прачытаць не адну сотню кніг!

А можна (пакуль яшчэ!) на канікулы з'ездзіць у вёску.

## БЫЛО І ЗАСТАЛОСЯ

Горад (сталіца!), галоўны праспект. Кажуць, ён шырэйшы за Неўскі?

І дамы на ім таксама прыгожыя.

На першых паверхах крам шмат. Асобныя, можна сказаць, наскрозь праглядаюцца, бо ад вуліцы сцен няма, замест іх — велізарнае шкло, за якім проста безліч тавараў і столькі святла...

Міжволі запавольваеш крок, міжволі адчыняеш дзверы, заходзіш.

Першае, што бачыш: пакупнікоў там няма, бо цэны (гэта другое, што бачыш) — проста непад'ёмныя. А вось прадаўцоў шмат — маладых, добразычлівых, напэўна ж кваліфікаваных. Стаяць, «ахоўваюць» тавары, перамаўляюцца — гадзінамі, дзень пры дні...

Расказвалі, некалі ў адной паляшуцкі вялікая радасць была. Яе дачку на працу ўзялі — да высокага начальства, у прыёмную. За стол там пасадзілі — з друкавальнай машынкай. «І што ж яна там робіць?» — пыталіся вяскоўцы ў матулі. «Дуркуе...» — з форсам адказвала тая.

З таго часу паўстагоддзя прайшло! А слова, бач, не забылася.

Бо не знік «працэс»?

## ГАДЫ́ ЯК ГА́ДЫ

«Аловачак можа быць дрэнны, але ж нават такі ён лепшы, чым добрая памяць», — разважае знаёмы дзед.

У яго апошнім часам завядзёнка з'явілася — перад кожным выхадам з дому «шпаргалку» сабе пісаць: куды, напрыклад, трэба схадзіць, што канкрэтна купіць.

— Гэта зручна, — смяецца Пятровіч, — у краму ці ў аптэку потым зайшоў, руку — у кішэню, а «шпаргалкі»... няма, дома забыўся!

Ці ў яго ж яшчэ адна прыгода была. Вечарам надоечы спаць лёг, а сон чамусьці не ідзе: адчувае, што нешта не так.

Устаў з ложка, пахадзіў па кватэры, сам сябе праверыў: тэлевізар выключыў, пліту і чайнік — таксама, краны ўсе закруціў, дзверы замкнуў... Выходзіць, поўны парадак?

Дзед — задаволены сабою — лёг, старанна ўкрыўся...

У апошні момант заўважыў — святло не выключыў.

## ЖАРТ?

Калі топішся, то і за брытву хопішся; калі спазняешся, паедзеш хоць на чым: прыпынак-другі на аўтобусе, потым — на метро і на трамваі б... Але яго (патрэбнага) усё няма і няма. Затое непатрэбных...

З чарговага — з шумным «Лёнік, здароў!» — «вывальваюцца» двое дзецюкоў, з абдымкамі налятаюць на трэцяга, пра штосьць гамоняць...

Сустрэча як сустрэча, карацей... Ва ўсякім разе — спачатку.

— Слухай, а чаго мы тут стаім? — гучыць трохі пазней. — Пайшлі — недзе пасядзім... Альбо паедзем да нас...

— Не, — рашуча «адбіваецца» Лёнік, — давайце не сёння, бо сёння я з вёскі еду. Бацька свінчо закалоў, маці квашанай капусты дала. Куды я з гэтымі вандзэлкамі?

— З гэтымі — толькі да нас! — кажуць дзецюкі, разбіраючы сумкі. — А без вандзэлкаў на халеру ты нам? Мы б цябе, можа, і не клікалі.

...У кожным жарце ёсць доля жарту. Астатняе, кажуць, праўда.

## НЕ ПРА ГРЫЎКУ

Цырульніка ў тым мястэчку даўно няма, праблем са стрыжкай, здаецца, таксама. Нехта прызвычаіўся ездзіць у райцэнтр, нехта — перайшоў на самаабслугоўванне, гэта значыць, сам стрыжэ сваіх сямейнікаў, сяброў, суседзяў.

У Клавы, напрыклад, гэта ці не новай прафесіяй з гадамі стала: пастаянныя кліенты з'явіліся — і да яе дадому прыходзяць, і да сябе запрашаюць...

Нядаўна вось прыяцелька пазваніла, папрасіла да яе суседкі пад'ехаць — пастрыгчы, пафарбаваць валасы. Клаве што — яна з задавальненнем: і пазнаёмілася-пагасціла ў добрага чалавека, і ўсё зрабіла: дагадзіла як быццам. Бо «кліентка» яшчэ і назаўтра пазваніла ёй, каб падзякаваць, каб сказаць, што стрыжка проста выдатная. Адзінае — у наступны раз можна грыўку даўжэйшай пакінуць, а то крыху караткаватая, на бігудзі не бярэцца. А трэба, каб бралася...

Клава, як той казаў, у асадак ледзьве не выпала, бо кліенты той без малога 90 гадоў! І ў апошнія пяць з дому яна — ні нагой.

## ПРЫКЛАД, ВАРТЫ ПЕРАЙМАННЯ

Не пазнаць некалі маленькую, некалі старэнькую хатку ў вёсцы! За год пры ёй маладзенькі садок з'явіўся, а яшчэ — новыя вокны-дзверы, новы дах, шалёўка, веранда...

Бо новы гаспадар — адраджае дом, а разам з ім...

Моду ўзяў — вяскоўцаў на сваёй машыне падвозіць, адмыслова плату бярэ. Ну вось напрыклад. Нехта галасуе пры дарозе альбо просіць па электрычку «подбросить», абяцае заплаціць.

Валодзя тады пытаецца:

— А вы беларус?

— Так.

— А мову беларускую ведаеце?

— Не вельмі...

— Будзеце размаўляць са мной пабеларуску, — падвязу, куды скажаце, і грошай не вазьму, а не — тарыф двайны. Згодныя?

...Адзін пенсіянер (Валодзя расказваў) так і заплаціў, бо ўсю дарогу спрабаваў даводзіць, што ў Беларусі няма і ніколі не было ніводнага вартага пісьменніка. Другога — маладога, які сцвярджаў, што ў Беларусі і мовы няма, Валодзя проста высадзіў...

— Бо трэба ж з гэтым нешта рабіць, — упэўнены ён.

Трэба.

І ці толькі яму?

## ПОДЫХ ЧАСУ

Круці не круці, а трэба ўмярці: трэба скончыцца восені, распачацца зіме.

Цётку Яню напярэдадні сын у горад забраў. Так яму спакайней. Ды і цётцы — і цяплей, і трохі весялей. Ёсць, прынамсі, з кім пагутарыць, ёсць каму расказаць, як жа цяжка некалі жыла, як шмат працавала, бо вёска, бо вялікая гаспадарка, бо чацвёра дзяцей — і ніякіх табе пральных машын ды газавых пліт... А яшчэ ж і на працу штодня хадзіла: іх «Маяк камунізму» на ўвесь раён грымеў!

— Хто-хто грымеў? — перапытвае ўнук.

— Ды калгас наш — «Маяк камунізму».

— Ён што — так і называўся? — здзіўляецца хлопец і пачынае рагатаць, прычым так заразліва, так залівіста, што да яго міжволі далучаецца бабулін сын, а ўрэшце і яна сама...

Бо сапраўды ж — смешна.

І трохі дзіўна: калгас атрымаў гэту назву на пачатку пяцідзясятых, насіў яе цэлымі дзесяцігоддзямі і ніхто не смяяўся — не было з чаго.

А потым — з'явілася... Адкуль?

## ПОШУКІ ШЧАСЦЯ

...Зрок «сеў», прычым незаўважна. Яшчэ ўчора, здаецца, чытала ў аўтобусах, і для гэтага далёкай цьмянай лямпачкі было зусім дастаткова. А сёння...

У крамцы, як на ліха, апошні пакет смятаны. Ды і той, відаць, зганьбаваны — застаўся толькі таму, што «зманаўся» на ім тэрмін прыдатнасці: не чытаецца і ўсё тут. Можа, хіба ў акулярах?

Адчыняю сумачку — іх няма: трэба разумець, на працы забылася. Садовая галава!

Але ж прычоску на ёй папраўціць можна? І — адначасова — «знайсці» прапажу: на лбе акуляры!

...Кажуць, што акурат таксама многія шукаюць шчасце. Гадамі, а то і дзесяцігоддзямі чакаюць яго, гадамі, а то і дзесяцігоддзямі, мараць пра штосьць незвычайнае ды скардзяцца на тое, што ёсць.

І толькі потым, страціўшы свае сілы і час на чаканне-шуканне, раптам пачынаюць разумець, што шчасце, як тыя акуляры, сядзела «на пераноссі».

Ці трохі вышэй.

## КРАДЗЕЖ ВЕКУ

...Ён казаў яе, казаў — як ніхто, ніхто і ніколі»: абрываў тэлефон і пісаў лісты, спрабаваў закідваць кветкамі і падарункамі, сустракаць з работы, начаваць пад вокнамі...

Яна ж павінна была гэта ўбачыць?

Яна павінна была адказаць — тым жа!

Не, не з ягоным шчасцем...

Не хацелася ў гэта паверыць, не хацелася адступаць. Але ён урэшце змог. Сказаў, што не будзе больш непакоіць... Хіба — двойчы на год: 26 верасня, каб павіншаваць з днём нараджэння, і 14 лютага, каб сказаць, што кахае, кахае да скону... А калі ў нейкі год пра гэта не скажа, «значыць, усё — сканаў»...

Зрэшты, падчас той апошняй сустрэчы ён гаварыў шмат. І, напэўна, праз гэта словы яго зусім «не чаплялі» — праляталі міма вушэй. Больш за тое, яны б, відаць, забыліся, калі б... не збыліся. Бо ён і сапраўды знік: не званіў, не пісаў, не сустракаў, не начаваў... «Аб'яўляўся» хіба двойчы на год...

Нельга сказаць, што яна чакала гэтых «аб'яў». Проста ведала: ён як мінімум пазвоніць...

Сёлета — не пазваніў.

І як абакралі.

## ТАТА — МОЖА...

Будні, праца, штодзённасць: тэкст на стале — чужы, не сказаць, каб добры, не сказаць, каб дрэнны: можна друкаваць, але ж дапрацаваўшы...

Звыклая справа. І перад ёй — ці не звычны ўспамін. Малая дачушка, вялікага, можна сказаць, паэта напісала вершык, паказала бацьку. Той дужа ўсцешаны быў: ну яшчэ б — гены... Праўда, слоўка-другое хацеў папраўціць. Ён нават аловак «занёс», каб закрэсліць... Дзіця не дало, сказала:

— Не чапай, тата! Ты ўсё сапсуеш...

Тата можа... Што ўжо казаць пра іншых?

## КРЫЖ

Калі ток-шоу на тэлебачанні з'яўляюцца, значыць, гэта каму-небудзь трэба — каб глядзець, каб спадзявацца на дапамогу, каб вучыцца жыць ці нешта смачнае гатаваць, каб захапляцца... мужнасцю.

У адной з вядучых пасля страшнага ДТЗ дачка ў коме, паміж жыццём і смерцю, чацвёрты год.

Іншая маці з гора, можа, звар'яцела б, спілася, усё кінула... Гэтая — працуе, жыве, спадзяецца.

І гледачоў сваіх вучыць таму ж!

**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

■ Неасабісты суб'ектыў

# НА ПАДСВЯДОМЫМ УЗРОЎНІ



## Пра зруйнаваныя магілы, пошук каранёў і Белы дом у Аляксандраўскім скверы

Мне не даводзілася быць на могілках «Экімань», што ў ваколіцах Полацка, але месцічы кажуць, што адтуль добра відаць вежы Сафійскага сабора. Карункавыя крыжы, на фоне высокага неба прыкметныя ў любую пару года, камусьці нагадваюць аб вечным імкненні чалавека дасягнуць Нябёсаў; камусьці — аб тым, што ўсе рана ці позна прыйдзем да разумення нейкай найвышэйшай, але вельмі простай ісціны; камусьці — пра тое, што трэба ў мітусні штодзённасці знайсці час зайсці ў храм і памаліцца за здароўе жывых і спачын памерлых...

А камусьці вечныя сімвалы ні пра што не гавораць. Зрэшты, чаго чакаць, калі адключаюцца не толькі нейкія маральныя ўстоі, але і самы элементарны чалавечы розум. Я маю на ўвазе той кашмар, які ў мінулую суботу ўтварылі на могілках пад Полацкам трое маладых недавяркаў. З шалёнай апантанасцю (інакш, як шал, гэта сапраўды не назавеш, бо колькі ж сілы і імпэту было на гэта патрэбна) яны павалілі або ўвогуле разбілі помнікі на шасцідзесяці трох магілах, а на пяці больш свежых падпалілі вянкі і крыжы.

Вандалаў злавілі па гарачых слядах. Дваім — па шаснаццаць, «ідэйнаму натхняльніку» — дваццаць пяць. Цяпер яны ўзятыя пад варту і даюць паказанні. Кажуць, што былі п'яныя і самі не ведалі, што рабілі. Малодшыя валяць усё на старэйшага: маўляў, гэта на ім скура гарэла, ён і падбухторыў на «подзвігі». Зрэшты, следчыя разбяруцца. Пакаранне таксама абавязкова будзе — за апаганьванне пахаванняў прадугледжваецца да трох гадоў пазбаўлення волі, плюс людское асуджэнне і пагарда. Але паколькі выпадак, дзякуй Богу, для краіны ўвогуле не тыповы, а выключны, дзеля таго, каб ён такім адзінкавым і застаўся, ёсць пра што падумаць усім — і тым, хто прыйшоўшы ў выхадны на магілкі, стаяў, агаломшаны, ля разбуранага помніка, і тым, хто ўбачыў сюжэт у тэлевізійным выпуску навін.

Хтосьці скажа, што гэта звычайнае супадзенне, але мне ў гэтай гісторыі вось што асабліва не дае спакою. Могілкі руйнавалі ноччу перад Змітраўскімі Дзядамі, Бацькоўскай суботай, Асянінамі — у гэтай першай суботы лістапада ў народзе шмат назваў, але сутнасць адзіная: гэта дзень памінання памерлых. Калі мець на ўвазе гэты факт, а яшчэ тое, што завучана даводзім каторы год (камусьці ці самім сабе?): «Беларусы ў большай ступені, чым суседнія народы, захавалі культ шанавання продкаў...» Пагадзіцеся, здарэнне на полацкіх могілках набывае іншы маштаб, чым некалькі дзясяткаў апаганеных магіл. І пытанні паўстаюць іншыя — больш складаныя, няўтульныя. Напрыклад, калі і ад каго нашы маладыя людзі недаатрымалі нечага вельмі важнага? Важнага не для ведання, нават не для разумення — для падсвядомасці. Каб датычна пэўных рэчаў і ўчынкаў у ёй было чырвонымі літарамі напісана «НЕЛЬГА», і ніякая ступень апантанасці, ачмурэння, ап'янення ўсё роўна б не дазволіла гэту рысу перайсці, забарону парушыць. Калі мы ўпусцілі момант, калі стала (хай сабе і як выключэнне) магчымым тое, на што маральнае табу накладзена шматлікімі пакаленнямі, якія жылі да нас?

На пераломе эпох, калі распадалася вялікая краіна і нявечыліся ўсе без разбору яе ідэалы, мы ўсё ж здолелі многае захаваць. Напрыклад, памяць пра мінулую вайну, павагу да яе ахвяр — менавіта на тым самым, такім патрэбным, падсвядомым узроўні. А вось з павагай менавіта да свайго, спрадвечнага, што і ўчора, і сёння адрозніває нас ад іншых і разам з ужо згаданай памяццю робіць народам, — складаней.

Я ВАЗЬМУ на сябе смеласць выказаць здагадку, чаму так атрымалася. Гадоў дваццаць назад мы напачатку разгублена спрабавалі сярод лапцяў, лучын і каўтуноў (а менавіта яны былі атрыбутамі беларусаў у сонме брацкіх народаў) знайсці штосьці спрадвечнае, прыгожае, сваё, чым можна ганарыцца, што можна паказваць усяму свету, не саромеючыся. І знайшлі, і самі сабе здзівіліся, і пачалі развіваць знойдзенае, робячы з яго новы вобраз беларусаў — шляхетных, адукаваных, сапраўднай еўрапейскай нацыі з багатай слаўнай гісторыяй. Але, пакуль шукалі і ачомваліся ад здзіўлення, пэўную нішу ў нашай падсвядомасці заняла (і працягвае там бязбедна існаваць дагэтуль) іншая культура — зусім чужая, але нахабная, яркая, з ілюзіяй свабоды, якой усім так хацелася, і ўсёдазволенасці, якія многія і сёння са свабодай блытаюць.

Цяпер маем тое, што маем. У агульным, вялікім, бясспрэчна вельмі важным — ганарымся сваёй краінай, уласнай да яе прыналежнасцю, яе гісторыяй, з гонарам расказваем гасцям пра Скарыну і Малевіча, знаёмім іх з унікальнымі абрадамі і архітэктурай. У прыватным, асабістым — не менш важным — усё яшчэ саромеемся, усё яшчэ баімся «не адстаць ад цывілізацыі». Як вынік — на беларускай прадукцыі цэтлікі на замежнай мове, у сувенірнай краме, што ў адным будынку з касамі Купалаўскага тэатра ў Аляксандраўскім скверы, на самым бачным месцы (галоўны сувенір?) майка з выявай Белага дома і надпісам «Барак Абамы», на Усіх Святых не молімся за памерлых, не ідзём на могілкі, каб ушанаваць іх памяць, а, намаляваўшы на твары пачварную маску, адзначаем Хэлайн (ці моўчкі дазваляем рабіць гэта сваім дзецям). Нічога страшнага? А хіба зруйнаваныя магілы на «Экімані» — праз пару звёнаў — не ўпісваюцца ў гэты лагічны ланцужок?

